**2003 Кароткі змест**

## Даклад аб свабодзе веравызнання ў краінах свету

Распаўсюджаны Бюро па абароне дэмакратыі, правоў чалавека і працы

Свабода веравызнання з’яўляецца не толькі адной з асноўных амерыканскіх каштоўнасцей і краевугольным камнем дэмакратыі, але і адным з асноўных прынцыпаў знешняй палітыкі ЗША. Як неаднаразова падкрэсліваў Прэзідэнт Буш, свабода веравызнання з’яўляецца адным з ключавых складальнікаў намаганняў ЗША па гарантаванні бяспекі, абароне стабільнасці і падтрымцы свабоды. Свабода веравызнання ўмацовае стабільнасць і развіццё грамадзянскіх супольнасцей і зніжае прывабнасць рэлігійнага экстрэмізму і тэрарызму, заснаванага на рэлігіі. Апрача таго, свабода веравызнання з’яўляецца ўсеагульнай каштоўнасцю, не абмежаванай ні рэгіёнам, ні веравызнаннем, але прызнанай міжнародным заканадаўствам і шматлікімі рэлігійнымі традыцыямі ў краінах свету.

“Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека” (УДПЧ), прынятая ў 1948 г. Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб’яднаных Нацый, абвяшчае “годнасць ... і роўныя і неад'емныя правы ўсіх членаў чалавечай сям'і”. У дэкларацыі адзначана, што "пагарджанне і непавага ў стаўленні да правоў чалавека прывялі да здзяйснення варварскіх актаў, якія ўзрушылі сумленне чалавецтва". У якасці аднаго з самых высокіх імкненняў чалавецтва дэкларацыя абвесціла стварэнне свету, у якім людзі маглі б карыстацца свабодай веравызнання. У Артыкуле 18 УДПЧ абвешчана, што "кожны чалавек мае права на свабоду думкі, пераканання і веравызнання; гэта права ўключае свабоду змяняць рэлігію ці веравызнанне і свабоду вызнаваць сваю рэлігію ці перакананні асобна, або сумесна з іншымі, публічна ці ў прыватным парадку ў навучанні, богаслужэнні і адпраўленні рэлігійных культаў, рытуалаў і абрадаў."(гл. Дадатак А).

Палажэнні Усеагульнай дэкларацыі знайшлі адлюстраванне ў асноўных міжнародных пагадненнях, якія абавязваюць краіны паважаць свабоду веравызнання, такіх як Міжнароднае пагадненне аб грамадзянскіх і палітычных правах і Дэкларацыя аб ліквідацыі ўсіх форм неталерантнасці і дыскрымінацыі на падставе рэлігіі або веравызнання. (гл. Дадатак В). Урады пераважнай большасці дзяржаў узялі на сябе абавязацельствы абараняць згодна з гэтымі пагадненнямі права на свабоду веравызнання ўсіх, хто пражывае ў межах гэтых дзяржаў.

І ўсё ж, нягледзячы на існаванне гэтых, прызнаных усімі міжнародных інструментаў права, значная частка насельніцтва свету жыве ў краінах, дзе права на свабоду веравызнання абмяжоўваецца ці падвяргаецца забароне. Мільёны людзей жывуць ва ўмовах таталітарных і аўтарытарных рэжымаў, якія імкнуцца кантраляваць рэлігійныя вераванні і рэлігійную абрадавую практыку. Некаторыя рэжымы варожа ставяцца да рэлігійных меншасцяў, "непацверджаных афіцыйна" рэлігій, іншыя – праяўляюць цярпімасць да праследаў і дыскрымінацыі і тым самым падтрымліваюць апошнія. Урады іншых краін, як з развітой дэмакратыяй, так і тых, што знаходзяцца на стадыі станаўлення дэмакратычнага ладу, прымаюць дыскрымінацыйныя законы і

праводзяць палітыку, скіраваную на наданне пераваг адной рэлігіі адносна іншых.

Урады некаторых дзяржаў замацоўваюць неабгрунтаваныя і цяжкія для выканання патрабаванні да рэгістрацыі рэлігійных суполак і забараняюць ім збірацца, адпраўляць богаслужэнствы і абрады або займацца іншымі відамі рэлігійнай дзейнасці да таго часу, пакуль апошнія не зарэгіструюцца. Такое патрабаванне ўжо па сваёй прыродзе стварае глебу для злоўжыванняў з боку мясовых органаў улад, нават у тым выпадку, калі падобныя патрабаванні уведзены цэнтаральнай уладай без імкнення аказаць уціск на рэлігійныя суполкі. Гэтак жа як і заканамерная занепакоенасць дэструктыўнымі і супрацьпраўнымі паводзінамі невялікай колькасці рэлігійных суполак не павінна прыводзіць да дыскрымінацыйнага стаўлення або ганьбавання ў стасунках да іншых, мірных і не парушаючых закон, сяброў гэтых суполак. Гэтая праблема з'яўляецца выключнай для пэўных краін Цэнтральнай Азіі, Усходняй Азіі і Бліжняга Усхода, дзе ўведзены сур'ёзныя абмежаванні свабоды веравызнання шляхам вузкага вызначэння адзіна прымальнага і афіцыйна прызнанага рэлігійнага культу. Апроч таго, некаторыя дэмакратычныя дзяржавы Заходняй Еўропы праводзяць палітыку, накіраваную на ганьбаванне рэлігійных меншасцяў, адносячы іх да небяспечных "сект" ці "культаў". Такая практыка прадстаўляе сабой асобую пагрозу ў сувязі з тым, што некаторыя краіны Сярэдняй Азіі і іншых рэгіёнаў сцвярджаюць, што ў якасці мадэляў для сваіх стрымліваючых і абмяжоўваючых магчымасці рэгістрацыі рэлігійных суполак законапраектаў яны пераняслі "антыкультавыя" законы і меры Заходняй Еўропы.

Аналізуючы ўмовы свабоды веравызнання ў краінах свету дадзены даклад ставіць за мэту адлюстраваць уплыў гісторыі, культуры і традыцый. Пэўная рэлігія магла дамінаваць сярод нацыі на працягу стагоддзяў, што ўскладняе прызнанне новых веравызнанняў, якія кідаюць выклік культуры і тэалогіі. Аднак традыцыі і культура не павінны выкарыстоўвацца ў якасці падставы для прыняцця законаў або палітыкі, якія абмяжоўваюць шчырыя рэлігійныя вераванні ці іх законныя праяўленні.

Урад ЗША па-ранейшаму занепакоены дыскрымінацыяй і насіллем супраць асоб усіх веравызнанняў і этнічных груп. Дыскрымінацыя і насілле супраць мірных вернікаў супярэчыць Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і іншым міжнародным пагадненням, што складаюць аснову нашай дзейнасці па абароне права свабоды веравызнання ва ўсім свеце.

Антысемітызм, напрыклад, з'яўляецца як рэлігійнай так і этнічнай дыскрымінацыяй і працягвае заставацца праблемай, якая выклікае сур'ёзную заклапочанасць урада ЗША і міжнароднай супольнасці. У дакладзе за 2003 год паказаны занепакойваючы рост антысемітскіх настрояў ў некаторых еўрапейскіх краінах. Звярнуўшыся да гэтай праблемы ўдзельнікі канферэнцыі па антысемітызму, якая адбылася ў чэрвені ў Вене, прызналі антысемітызм праблемай правоў чалавека.

У выніку, палітыка і практычныя меры, якія кожная краіна ажыццяўляе адносна свабоды веравызнання, павінны ацэньвацца з улікам міжнародных норм права. ЗША усведамляюць уласную адказнасць перад гэтымі прававымі актамі пры гарантаванні і абароне свабоды веравызнання.

Дадзены даклад складаецца з трох частак. У частцы I вызначаны краіны, дзе свабода веравызнання абмяжоўваецца і дзеянні і палітыка ўлад у гэтым кірунку класіфікуюцца паводле пяці катэгорый. Частка II утрымлівае прыклады краін, урадамі якіх былі прыняты значныя захады ў падтрымку ці абарону свабоды веравызнання, хаця ў гэтых краінах не выключана наяўнасць сур'ёзных праблем. Частка III змяшчае пералік дзеянняў урада ЗША па заахвочванні іншых краін да падтрымкі свабоды веравызнання.

Чытачы павінны мець на ўвазе, што некаторыя краіны згадваюцца больш чым у адной частцы даклада, у залежнасці ад разглядаемых дзеянняў ці абмяркоўваемай сітуацыі. У частцы I некаторыя краіны маглі б закранацца паводле ўсіх пяці катэгорый, аднак з меркаванняў краткасці выкладу, названыя краіны згадваюцца толькі аднойчы, у катэгорыі, што найбольш поўна характарызуе існуючыя ў краіне перашкоды ажыццяўленню свабоды веравызнання.

**Раздзел I: Перашкоды захаванню свабоды веравызнання ў краінах свету**

**Спробы таталітарных ці аўтарытарных рэжымаў кантраляваць рэлігійныя вераванняі і рэлігійную дзейнасць**

Таталітарныя і аўтарытарныя рэжымы вызначаюцца імкненнем кантраляваць думкі і іх выражэнне, асабліва іншадумства. Падобныя рэжымы схільныя лічыць некаторыя ці ўсе рэлігійныя суполкі ворагамі дзяржавы з прычыны ідэалагічнага зместу рэлігіі, таго факту, што самое богаслужэнне пагражае дамінуючай ідэалогіі (звычайна шляхам адцягення ўвагі да дзяржавы з боку адэптаў у недзяржаўную сферу ўплыву), пэўнай этнічнай арыентацыі рэлігійнай суполкі ці ўсіх трох фактараў разам. Наяўнасць аднаго ці больш з пералічаных элементаў звычайна вядзе да забароны рэлігіі рэжымам.

**Бірма.** Урад працягвае разглядаць рэлігійную свабоду з пункту гледжання пагрозы, якую яна можа прадстаўляць для нацыянальнага адзінства. Урад пры выкарыстанні органаў бяспекі шляхам укаранення агентаў ці ажыццяўлення назірання кантраляваў правядзенне сходаў і дзейнасць практычна ўсіх арганізацый, уключаючы рэлігійныя. Сістэматычна абмяжоўваліся ўсе намаганні буддысцкіх святароў садзейнічаць развіццю правоў чалавека і палітычныя свабоды, чыніліся перашкоды або забараняліся пабудовы храмаў і месцаў для адпраўлення набажэнстваў рэлігійнымі меншасцмі, прымусова прапагандаваўся буддызм у якасці асноўнай рэлігіі, асабліва сярод нацыянальных меншасцяў. Суполкі хрысціян з павялічанымі цяжкасцямі атрымлівалі дазвол на будаўніцтва новых храмаў у большасці рэгіёнаў; мусульмане паведамілі, што ім у асноўным было адмоўлена ў дазволе пабудаваць новыя мячэці або нават пашырыць плошчу ўжо існуючых на ўсёй тэрыторыі краіны. Выпадкі насілля супраць вернікаў-мусульман, абмежаванні паломніцтваў і назіранні за адпраўленнямі культу паўсюдна у краіне, павялічыліся на працягу апошніх гадоў. Урад увёў кантроль і цэнзуру ўсіх публікацый, уключаючы рэлігійныя, практычна забаронены публічныя сходы, у тым ліку рэлігійныя сустрэчы, колькасць удзельнікаў якіх перавышае пяць чалавек. Абмежаванні, уведзеныя ўрадам у дачыненні да публічных выступленняў, СМІ, сходаў

гармадзян і палітычных партый і рухаў, а таксама абмежаванні перамяшчэнняў дыпламатаў, ускладнілі працэс своечасовага і паслядоўнага збору інфармацыі аб стане правоў чалавека і рэлігійнай свабодзе ў Бірме.

**Кітай.** Хаця ўзровень умяшальніцтва ўрада ў рэлігійнае жыццё адрозніваецца ў залежнасці ад рэгіёну, урад працягвае прыкладаць намаганні па абмежаванні адпраўленняў рэлігійных абрадаў толькі афіцыйна прызнанымі канфесіямі і ў месцах, вызначаных для богаслужэння. Незарэгістраваныя рэлігійныя групы зведалі розную ступень уціску і ўмяшальніцтва ў свае справы з боку афіцыйных улад. Сябры некаторых незарэгістраваных рэлігійных суполак зведалі ўціск, часам у форме запалохвання, пераследу, арышту. У некаторых мясцовацях лідэры “падпольных” рэлігійных суполак паведамлялі аб павелічэнні ціску на іх з мэтай рэгістарцыі як з боку дзяржаўнай Адміністрацыі па справах рэлігіі, так і з боку мясцовых яе прадстаўніцтваў. Таксама паведамлялася аб патрабаваннях улад да рэлігійных суполак аб’ядноўвацца і падпарадкоўвацца афіцыйнай партыйнай арганізацыі, звязанай з афіцыйна прызнанымі канфесіямі, у супрацьлеглым выпадку названыя суполкі будуць забаронены. Некаторыя мясцовыя ўлады працягвалі селектыўны пераслед незарэгістраваных цэркваў, манастыроў і мячэцяў, у той час як цэнтральныя ўлады не прымалі належных мер па спыненні падобных дзеянняў. Паліцыя зачыніла “падпольныя” мячэці, храмы і семінарыі, а таксама і каталіцкія храмы і пратэстантскія малельныя дамы, многія з якіх мелі вялікую колькасць прыхажан, валодалі значнай маёмасцю, фінасавымі сродкамі і мелі разгалінаваную рэгіянальную структуру. Многія лідэры рэлігійных суполак і іх паслядоўнікі былі затрыманы, арыштаваныя або адбывалі турэмнае пакаранне. Мясцовыя ўлады таксама выкарыстоўвалі адміністратыўныя працэсы з мэтай пакарання сяброў незарэгістраваных рэлігійных суполак, з дапамогай чаго грамадзяне прыгаворваліся пазасудовай групай прысяжных, якая складалася з паліцэйскіх і чыноўнікаў органаў улады, да трох гадоў папраўча-працоўных лагероў. Многія затрыманыя і зняволеныя па рэлігійных прычынах працягвалі знаходзіцца ў падобных умовах на працягу перыяду, які ахоплівае дадзены даклад. Урад таксама працягваў рэпрэсіі супраць рэлігійных суполак, вызначаных як “секты” у цэлым і супраць Фалунь Гон у прыватнасці. У этнічна нестабільных рэгіёнах, асабліва сярод уйгураў у аўтаномным раёне Сіньцзян, мясцовымі уладамі чыніліся перашкоды будаўніцтву мячэцяў і абмяжоўвалі выкладанне ісламу дзецям. У дадатак, настаўнікам, выкладчыкам і студэнтам універсітэтаў раёна Сіньцзян забаранялася публічнае спавяданне і адпраўленні рэлігійных культаў. У Тыбеце, нягледзячы на частковы дазвол улад выконваць некаторыя традыцыйныя рэлігійныя рытуалы і публічна вызнаваць рэлігію, дзеянні, успрымаемыя Урадам як праваднікі палітычнага іншадумства, напрыклад рэлігійныя абрады, якія прапагандуюць незалежнасць Тыбета або іншыя формы сепаратызму, былі неадкладна і рашуча забаронены. Абмежаванні, датычныя адпраўлення рэлігійных культаў і месцаў богаслужэнняў і ўзровень рэпрэсій у Тыбеце значна ўзраслі.

**Куба.** Урад працягваў прыкладаць намаганні па кантролю і назіранню за рэлігійнымі арганізацыямі і адпраўленнямі культу, выкарыстоўвачы сачэнне, укараненне агентаў і пераслед рэлігійных суполак, кліра і вернікаў. Органы

дзяржаўнай бяспекі наведвалі некаторых святароў і настаяцеляў падчас значных рэлігійных падзей з мэтай нібыта папярэдзіць іх аб тым, што дысідэнты “выкарыстоўваюць царкву”. Агенты службы дзяржаўнай бяспекі перасцерагалі некаторых жонак палітзняволеных магчымасцю арышта ад удзелу сумесна з іншымі жанчынамі ў набажэнстве ў касцёле Санта-Рыта ў Гаване. Улады ігнаравалі шэраг заяў рэілігійных суполак з просьбай афіцыйнага прызнання, падштурхоўваючы тым самым сяброў гэтых суполак да ўдзелу ў нелегальных аб’яднаннях, а таксама працягвалі адмаўляць у атрыманні дазволу на будаўніцтва храмаў, чым вымушаў многія храмы звяртацца за дазволамі на правядзенне богаслужэнняў у прыватных дамах. Працэс атрымання дазволу на правядзенне рэкантсрукцыі ўжо існуючага месца адпраўлення богаслужэння і набыццё будаўнічых матэрыялаў запавольваўся і патрабаваў значных фінансавых выдаткаў. Дзейнасць канфесій па арганізацыі школ, навучанню сяброў рэлігійных суполак, таксама, як і публікацыі рэлігійнай літаратуры, падвяргаліся жорсткім абмежаванням. У дадатак, урад забараніў карыстанне Інтэрнэтам шэрагу рэілігійных суполак.

**Лаос.** Становішча свабоды веравызнання часткова палепшылася ў асобных частках краіны, і пагоршылася на іншых тэрыторыях. Урад Лаоса працягваў перашкаджаць адпраўленню рэілігійных культаў усімі асобамі, асабліва ж тымі, хто належыць да рэлігійных меншасцей. Маецца шэраг паведамленняў аб ціску, які ажыццяўлялі мясцовыя ўлады, прымушаючы хрысціянскую меншасць адмовіцца ад сваёй веры, зафіксаваны таксама па меншасці адзін выпадак, калі сельскіх жыхароў, што спавядалі хрысціянства, прымусілі пакінуць свае вескі з прычыны іх веравызнання. Вядомы шэраг выпадкаў, калі людзей арыштоўвалі за адпраўленне імі рэлігійных абрадаў, у прыватнасці ў правінцыі Сіванакет. Урад таксама перашкаджае іншаземцам займацца місіянерскай дзейнасцю і схіляць да сваёй веры, замежныя грамадзяне, затрыманыя падчас распаўсюджвання рэлігійнай літаратуры будуць арыштаваныя або высланыя з краіны.

**Паўночная Карэя.** Сапраўднай свабоды рэлігіі не існуе. Урад працягвае пераслед любых форм рэлігійнай актыўнасці, апроч дзейнасці кантралюемых з боку дзяржавы рэлігійных суполак. З’яўляюцца паведамленні аб пакараннях смерцю, катаваннях і турэмных зняволеннях вернікаў. Праваабарончыя і вераахоўныя групы, якія дзейічаюць за межамі краіны прадставілі шматлікія, звычайна не пацверджаныя ўладамі, паведамленні аб збіванні, арыштах і забойствах у дачыненні прыхажан падпольных цэркваў з прычыны іх веравызнаўчай прыналежнасці. Па непацверджаных дадзеных, асобы, што займаліся місіянерскай дзенасцю або мелі стасункі з замежнымі хрысціянскімі пратэстанцкімі суполкамі, якія дзейнічалі на тэрыторыі Кітайскай народнай рэспублікі, былі пакараныя. У красавіку 1999 года, а таксама ў траўні і чэрвені 2002 г. Кангрэсу былі прадстаўлены доказы таго, што зняволеныя, якія адбываюць турэмнае пакаранне па рэлігійных прычынах, знаходзяцца ў значна горшых умовах, чым іншыя зняволеныя. Хаця такія паведамленні вельмі складана пацвердзіць, агульны аб’ём інфармацыі аб асобных выпадках прыняцця жорсткіх мераў з мэтай спынення несанкцыянаванай рэлігійнай дзейнасці дазваляе мяркаваць, што такія паведамленні з’яўляюцца верагоднымі.

**В’етнам.** Урад працягваў значна абмяжоўваць грамадскую дзейнасць непрызнаных дзяржавай рэілігійных суполак, роўна як і афіцына прызнаных канфесій, калі іх дзейнасць разглядалась як неадлюстроўваючая дзяржаўных інтарэсаў. Рэілігійныя суполкі сутыкнуліся з цяжкасцямі пры навучанні і пасвячэнні ў сан святароў, а таксама на працягу ажыццяўлення адукацыйнай і гуманітарнай дзейнасці. Па звестках, у правінцыях паўночна-заходняга і цэнтральнага высакагор’я афіцыйныя улады прымусоўвалі пратэстантаў рэлігійнай меншасці плямёнаў Хмонг і Монтанард адмовіцца ад сваёй веры. Па верагодных звестках, паліцыя аказвала ціск, неаднаразова затрымлівала, збівала вернікаў, большай часткай у высакагорных правінцыях, населеных прадстаўнікамі этнічных меншасцяў. Зыходзячы з паведамленняў, урад таксама санкцыянаваў разбурэнне і знішчэнне месцаў адпраўлення культаў, якія знаходзіліся ў асноўным у Цэнтральна-высакагорных правінцыях. Урад таксама працягвае жорстка кантраляваць магчымасці доступу дыпламатаў, неурадавых чыноўнікаў, журналістаў, і іншых замежнікаў у Цэнтральныя і Паўночна-заходнія высакагорныя правінцыі, ускладняючы праверку сітуацыі і ўмоў захавання свабоды веравызнання ў гэтых рэгіёнах.

**Варожае стаўленне дзяржавы да рэлігійных меншасцяў або непрызнаных афіцыйна рэлігій**

Урады некаторых краін, якія не абавязкова адмаўляюць выкананне праграм па кантролю за станам рэлігіных меншасцяў, тым не менш варожа ставяцца да пэўных рэлігій ці рэілігійных суполак, азначаных як “пагроза бяспецы”. Урады праводзяць палітыку, скіраваную на запалохванне такіх суполак, прымушаючы іх паслядоўнікаў перайсці ў іншую веру або прынудзіць сяброў суполак эміграваць.

**Іран.** Міністэрства ісламскай культуры і кіравання, а таксама Міністэрства разведкі і бяспекі працягвалі пільнае назіранне за рэлігійнай дзейнасцю. Прыналежныя да рэлігійных меншасцяў асобы, уключаючы бахаі, габрэяў, хрысціян, мусульман-суфітаў і сунітаў, падвяргаліся рознай ступені дыскрымінацыі з боку афіцыйных уладаў: затрыманням, арыштам, пераследам і турэмнаму зняволенню. Яны таксама скардзіліся на дыскрымінацыйнае стаўленне ў прадстаўленні ім магчымасці адукацыі, працаўладкавання і забеспячэння жыллём. Падобныя рэпрэсіўныя меры ў большай ступені закранулі вернікаў бахаі, чыю веру урад разглядае як ерэтычную ісламскую секту з палітычнымі поглядамі, якія супярэчаць ідэям іранскай рэвалюцыі. Урад асабліва павялічыў абмежаванні і перашкоды місінерскай дзейнасці хрысціян-евангелістаў. Урадавая анты-ізраільская палітыка, разам з перакананнем мусульман, што габрэі больш спагадаюць Ізраілю, чым сваёй роднай краіне, стварыла пагрозлівую атмасферу для нешматлікай габрэйскай супольнасці. Законы, заснаваныя на рэлігійных запаветах, выкарыстоўваліся для задушэння свабоды самавыражэння. У лістападзе 2002 года іранскі акадэмік Хашэм Агаджары быў асуджаны на смеротнае пакаранне за богазневажанне, абвінавачванне базіравалася на яго прамове ў чэрвені 2002 года, у якой ён заклікаў мусульман не падпарадкоўвацца слепа ва ўсім волі духавентсва.

**Ірак.** (Наступныя заўвагі адносяцца да статуса рэлігійных свабод падчас праўлення рэжыма Садама Хусейна.) як і папярэднія гады, рэжым Садама Хусейна ажыццяўляў рэпрэсіўныя меры ў дачыненні да любых рэлігійных суполак ці арганізацый, якія разглядаліся як не аказваючыя падтрымкку рэжыму. Урад таксама працягваў палітыку рэпрэсій у дачыненні да рэлігійных лідэраў мусульман-шыітаў. Нягледзячы на тое, што шыіты з'яўляюцца большай па колькасці рэлігійнай канфесіяй, эканамічнае і палітычнае лідэрства сканцэнтраванае ў сунітаў. Урад неаднаразова незаконна перашкаджаў або забараняў адпраўленне шыіцкіх рэлігійных абрадаў і дзесяцігоддзямі праводзіў кампанію забойстваў, спрошчанай працэдуры вынясення прысудаў, адвольных арыштаў, працяглях пазбаўленняў волі лідэраў і вернікаў, якія належалі да шыіцкай большасці. Урад сістэматычна праводзіў забойствы святароў-шыітаў, прадстаўнікі рэжыму апаганьвалі шыіцкія мячэці і святыя месцы, умешваліся ў працэс рэлігійнага навучання і перашкаджалі адпраўленню рэлігійных абрадаў шыітамі. Канстытуцыяй не прызнаныя асірыйцы, халдзеі і язіды, Урад таксама рабіў спробы знішчэння ідэнтытэту хрысціянскай меншасці (асірыйцаў і халдзеяў) а таксама суполак язідаў.

**Пакістан.** Урад не змог забяспечыць выкананнне рэлігійных свабод і абараніць правы рэлігійных меншасцяў як з прычыны правадзімай дзяржаўнай палітыкі, так і ў выніку свайго нежадання прымаць меры супраць грамадскіх сіл, якія варожа ставяцца да тых, хто спавядае іншую рэлігію. Дыскрымінацыйнае заканадаўства, якое рэгулюе рэлігійную сферу на нацыянальным узроўні і атмасфера рэлігійнай нецярпімасці, што прывяла да здзяйснення актаў насілля, накіраваных супраць малаколькасных мусульманскіх суполак, таксама як і супраць хрысціян, меншасці, якая вызнае індуізм, прыхільнікаў розных адгалінаванняў ісламу (уключаючы суполкі ахмадзітаў і зікрытаў). У той час, калі ўрад не падтрымліваў насілля супраць суполак, здараліся выпадкі сацыяльнай расправы над прадстаўнікамі шыіцкай меншасці. Адсутнічае адэкватнае умяшальніцтва на дзяржаўным ўзроўні ў спыненне нарастання атмасферы рэлігійнай варожасці і актаў насілля супраць рэлігійных меншасцяў.

**Саудаўская Аравія.** Свабоды веравызнання не існуе. Урад працягвае прытрымліваіцца жорсткай кансерватыўнай разнавіднасці суніцкага ісламу і забараняе іншыя віды адпраўлення культу ісламскімі і неісламскімі канфесіямі. Мусульмане, якія не спавядаюць афіцыйную рэлігію, падвяргаюцца праследу з боку Мутаваін (рэлігійнай паліцыі). Прыхільнікі шыіцкай меншасці зведваюць палітычную і эканамічную дыскрымінацыю, напрыклад абмежаваныя магчымасці працаўладкавання, нізкая прадстаўнічасць у органах кіравання, перашкоды адпраўленням рэлігійных рытуалаў і пабудовы малельных месцаў, мячэцей, супольных цэнтраў. Урад працягваў арышты сяброў і лідэраў шыіцкай суполкі Ісмаілі ў правінцыі Найран. Вернікам немусульманам пагражае арышт, турэмнае зняволенне, цялеснае пакаранне або дэпартацыя калі яны будуць заўважаны ў рэлігійнай дзейнасці, якая прыцягнула ўвагу ўладаў. Маецца шэраг выпадкаў, калі імамы, якія атрымоўваюць заработак ад ураду, выкарыстоўвалі антыгабрэйскія і антыхрысціянскія заклікі ў сваіх пропаведзях. Урад абвясціў, аднак, што каля 2000 імамаў было змешчана з пасады за экстрэмісцкія пропаведзі. Індуісты, якія лічуцца політэістамі,

падвягаюцца значна большай дыскрымінацыі, чым хрысціяне, у выпадках выплаты кампенсацый за смерць або пашкоджанні.

**Судан.** Урад працягвае праводзіць палітыкку ісламізацыі, разглядаючы іслам як дзяржаўную рэлігію і зводзячы de facto грамадзян-немусульман да людзей "другога гатунку". Атрымаць рэгістрацыю рэлігійным суполкам цяжка. Урад не дае дазвол на будаўніцтва якіх бы то ні было храмаў на тэрыторыі Хартума, або ў сталіцах вобласцяў. Сродкі, выдадзеныя на праекты падтрымкі каталіцкай царквы, былі канфіскаваныя, калі праекты былі часова зачынены або змянілі месца знаходжання. Дзяржаўныя працоўныя вакансіі і кантракты былі зарэзерваваны выключна для мусульман, мусульмане таксама атрымліваюць невялікі пакет сацыяльных паслуг, які прадстаўлены дзяржавай, уключаючы медыцынскае абслугоўванне. У траўні выпуск англамоўнага штодзённіка "Хартум монітор" быў спынены, а аўтары выдання абвінавачаны ў тым, што падчас асвячэння рэлігійных падзей пісалі богазневажальна. У 2002 годзе армянская супольнасць даставіла камп'ютэрызаваны друкарскі прэс, каб друкаваць на ім рэлігійную літаратуру на армянскай мове, аднак урад адмовіўся выдаць ліцэнзію на карыстанне прэсам. Курсанты Народна-вызваленчай арміі атрымалі ісламскую падрыхтоўку. У турмах і калоніях для непаўналетніх падтрымліваемыя урадам ісламісты прымушалі неісламскіх зняволеных прыняць іслам. Немусульмане сустракалі перашкоды ў сваёй місіянерскай дзейнасці. Падчас складання даклада працягваліся перамовы паміж бакамі аб спыненні грамадзянскай вайны.

**Туркменістан.** Урад працягваў абмежаванне ўсіх форм рэлігійнага самавыражэння. Дзяржаўныя органы на ўсіх узроўнях, уключаючы суды, інтэрпрэтавалі законы такім чынам, каб дыскрымінаваць усіх, хто спавядае любую веру апрача падкантрольных уладам сунітскага ісламу і рускага праваслаўя. Улады выкарыстоўвалі закон у якасці перашкоды рэгістрацыі усіх іншых рэлігійных суполак, уключаючы тыя, што адпавядалі колькасным патрабаванням (500 чалавек) і істотна абмежавалі дзейнасць незарэгістраваных рэлігійных кангрэгацый, забараніўшы ім публічныя зборы, місіянерскую дзейнасць і распаўсюджванне рэлігійнай літаратуры і абмежаваў свабоду збору, дазволіўшы правядзенне богаслужэнняў толькі для сяброў суполак. Пераслед рэлігійных суполак з боку улад быў зменшаны ачынаючы з чэрвеня 2002 года, але ўжо ў сакавіку 2003 года аднавіўся. Падобны пераслед заключаўся ў затрыманнях, арыштах, канфіскацыі рэлігійнай літаратуры і матэрыялаў, ціску на грамадзян з мэтай прымусіць іх адмовіцца ад спавядання сваёй рэлігіі, агрозы высялення і звальнення з працы. Улады абмяжоўваюць колькасць мусульманскіх мячэцяў, кантралююць і ускладняюць атрыманне мусульманскай адукацыі, а таксама ўвялі абмежаванні колькасці людзей, якім было дазволена здзейсніць штогадовае паломніцтва ў Мекку. Прадвызначанае ўладамі выкарыстанне напісанага Прэзідэнтам Ніязавым свяшчэннай кнігі "Рухнама" у навучальных установах, мячэцях і рускіх праваслаўных цэрквах з'яўляецца абмежаваннем свабоды думкі, сумлення і веравызнання, а таксама замена імамаў, якія не садзейнічалі прызнанню "Рухнамы" свяшчэнным тэкстам узроўню Карана.

**Узбекістан.** Улады дазвалялі існаванне пануючых рэлігій, выкарыстоўваючы пры гэтым Закон “Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях” з мэтай абмежавання свабоды веравызнання іншых рэлігійных суполак. Урад працягваў праводзіць жорсткую кампанію супраць незарэгістраваных ісламскіх суполак, дзейнасць якіх лічылі звязанай з экстрымізмам або тэрарызмам, праводзячы арышты шматлікіх нібыта сяброў гэтых арганізацый і прыгаворваючы іх да вялікіх тэрмінаў пазбаўлення волі праз несправядлівыя судовыя працэсы. Колькасць арыштаў падазроных у экстрэмізме крыху зніліся, але працягвалі заставацца высокімі, нягледзячы на тое, што 923 чалавекі былі адпушчаны на волю ў рамках крупнамаштабнай амністыі 2002 года. Падобная кампанія рэпрэсій прывяла да таго, што ўлады пачалі насцяродана ставіцца да тых, хто строга прытрымліваецца выканання ўсіх рэлігійных абрадаў і рытуалаў, уключаючы частых наведвальнікаў мячэцяў, мужчын з барадой і жанчын у паранджы, стварыўшы тым самым атмасферу запалохвання і боязі набожных вернікаў. Уладамі пераследваліся хрысціянскія суполкі, у якія ўваходзяць этнічныя ўзбекі. Закон “Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях” не адпавядае міжнародным нормам права. Патрабаванні да рэгістрацыі рэлігійных суполак з’яўляюцца жорсткімі і цяжкія для выканання, у выніку чаго шэраг малаколькасных рэлігійных суполак зведалі цяжкасці пры рэгістарцыі, што падштурхнула іх дзейнічаць у нелегальных умовах або нават таемна. Забароненыя віды дзейнасці ўключаюць у сябе арганізацыю нелегальных рэлігійных суполак, пераконванне іншых людзей да ўступлення ў падобныя суполкі, прыцягненне непаўналетніх да ўдзелу ў дзейнасці рэлігійнай суполкі без дазволу бацькоў, удзел іх у набажэнствах, якія праводзяцца нелегальнымі рэлігійнымі суполкамі. Улады працягвалі забараняць місіянерскую дзейнасць, выкладанне рэлігійных дысцыплін у муніцыпальных школах і прыватнае выкладанне асноў рэлігіі, для публікацыі або распаўсюджвання рэлігійнай літаратуры патрабавалася ліцэнзія. За ажыццяўленне падобнай дзейнасці прымянялася пакаранне ў выглядзе штрафаў. У якасці пазітыўных зрухаў можна адзначыць той факт, што ўлады прадставілі закон “Аб веравызнанні” на разгляд групе экспертаў па свабодзе веравызнання Бюро дэмакратычных ініцыятыў і правоў чалавека Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе.

**Ігнараванне дзяржавай праблемы дыскрымінацыі або пераследу рэлігійных меншасцяў ці непрызнаных афіцыйна рэлігій**

Улады шэрагу краін увялі ў дзеянне законы або праводзяць палітыку, скіраваную супраць рэлігійнай дыскрымінацыі і пераследу, але пры гэтым недастаткова паслядоўна і актыўна рэагуюць на парушэнні свабоды веравызнання неўрадавымі арганізацыямі або чыноўнікамі мясцовых праваахоўчых органаў.

**Бангладэш.** Нягледзячы на тое, што грмадзяне мелі права свабодна адпраўляць рэлігійныя абрады, паліцэйскія сілы, па агульнаму прызанннню, не здольныя забяспечыць выкананне законаў і ўсталяванне парадку, часта не спяшаліся на дапамогу сябрам малаколькасных рэлігійных суполак, калі тыя станавіліся ахвярамі злачынстваў. Працягваюцца дыскрымінацыйныя дзеянні супраць будыйскіх, індуістскіх і хрысціянскіх меншасцяў.

**Егіпет.** Урад працягвае пераслед асоб, уключаючы мусульман, якія спавядаюць неагульнапрынятыя вераванні і адпраўляюць абрады, якія па словах уладаў “ганьбяць святыя рэлігіі”. Закон не прызнае пераход мусульман у іншыя рэлігіі і такія неафіты падпадаюць пад сацыяльную і дзяржаўную дыскрымінацыю. У лютым адбыўся перагляд справы 96 абвінавачаных, якія бралі ўдзел у насіллі ў снежні 1999 - студзені 2000 гг. у Эль-Куш, пад час якога загінулі 21 хрысціянін і 1 мусульманін. 93 абвінавачанных былі вызвалены з-пад арышту і апраўданы, а 3 асуджаны, але не па абвінавачванню ў смерці хрысціян. Працэс выдачы дазволу на будаўніцтва царквы вымагае шмат часу і не задаволяе хрысціянскую суполку вынікамі. Прадстаўнікі суполкі сцвярджаюць, што службы аховы перашкаджалі ім выконваць ужо маючае месца распараджэнне ўлад і што мясцовыя службы аховы стрымлівалі атрыманне або знішчалі дазволы на аднаўленне храмаў. Загад 1960 г., які забараняў дзейнасць суполкі бахаі і канфіскоўваў усю іх маёмасць працягвае заставацца ў сіле.

**Грузія.** Нападкі на рэлігійныя меншасці – насілле, незаконная канфіскацыя рэлігійнай літаратуры, зрывы богаслужэнняў і сутрэч вернікаў працягвалі адбывацца з маўклівага дазволу ўлад. Мясцовыя органы забеспячэння правапарадку і дзяржбяспекі не толькі не станавіліся на абарону правоў рэлігійных меншасцяў, але і бралі непасрэдны ўдзел у нападзенні на сяброў такіх груп. Міліцыя часта не рэагавала на атакі праваслаўных экстрэмістаў, у асноўным прыспешнікаў адлучанага ад царквы праваслаўнага святара айца Васілія Мкалавішвілі супраць сяброў рэлігійнай суполкі “Сведкі Іеговы” і іншых нетрадыцыйных рэлігійных меншасцей. Некаторыя палітычныя дзеячы нацыяналістычнай аренатцыі падкрэсліваць выключнае значэнне Грузінскай праваслаўнай царквы у межах сваіх палітычных праграм і крытыкаваць дзейнасць пратэстантскіх суполак, асабліва евангельскіх, як разбуральную. Міністэрства ўнутраных спраў (уключаючы міліцыю) і пракуратура ў большасці выпадкаў не заводзіла крымінальныя справы на праваслаўных экстрэмістаў за нападзенні на прадстаўнікоў рэлігійных меншасцяў і іх праваабаронцаў.

**Гватэмала.** Урад не забяспечвае выкананне “Пагаднення аб роўнасці і правах карэнных насельніцтва” 1995 г., якое прадугледжвае павагу да рэлігійных правоў карэнных жыхароў. Хаця ўрад не праводзіць палітыку дыскрымінацыі, адсутнасць рэсурсаў і палітычнай волі да рэалізацыі існуючых законаў і выканання мірных пагадненняў працягвалі абмяжоўваць свабоднае выражэнне традыцыйных рэлігійных вераванняў карэннага насельніцтва. Урад не забяспечвае дзеянне механізмаў свабоднага доступу ў культавыя месцы, дзе знаходзяцца рэлігійныя святыні крэннага насельніцтва, таксама як не забяспечвае зберагание і ахову гэтых месцаў як помнікаў архітэктуры. Камісія па вызначэнні культавых святынь, створаная па ініцыятыве урада ў кастрычніку 2002 г. не прыняла захадаў па ахове падобных помнікаў з часу свайго стварэння.

**Індыя.** Часам ураду не ўдавалася процістаяць актам варожасці супраць рэлігійных меншасцей. Падобныя нядбайнасці выклікаены часткова абмежаванасцю ўлады закона, якая ўласціва ўсяму дзяржаўнаму апарату, з іншага боку прававым і судовым прымусам, які часам не з’яўляецца эфектыўным. Два дзяржаўныя анты-празеліцкія законы былі прыняты ў

справаздачны перыяд. Нэфектыўнасць умяшальніцтва ўлад і процістаянне актам варожасці супраць рэлігійных меншасцей для некаторых экстрэмістаў можа быць сігналам поўнай беспакаранасці. Да канца справаздачнага перыяду не было вынесена ні аднаго прысуда ў сувязі са справай 2002 г., калі падчас падзей у Гуджараце загінула каля 2000 мусульман. Ахвяры масавых беспарадкаў у Гуджараце абвінавачваюць індуісцкіх нацыяналістаў у чыненні перашкод для вынясення абвінаваўчага прысуда індуістам, якія ўдзельнічалі ў беспарадках.

**Інданэзія.** Урад вызначыўся прагрэсіўнымі дзеяннямі, у прыватнасці па абмежаванні межканфесійнай варожасці на Малукскіх астравах і на цэнтральным Сулавесі, а таксама арыштоўваючы рэлігійных экстрэмістаў за здзяйсненне актаў насілля па рэлігійных матывах. Аднак, у шэрагу выпадкаў Урад не здолеў затрымаць і пакараць належным чынам экстрэмістаў, адказных за забойствы і іншыя злачынствы.

**Нігерыя.** У той час як Федэральны урад у асноўным з павагай ставіўся да выканання рэлігійных свабод, назіраліся выпадкі, калі рэлігійныя адпраўленні абмяжоўваліся па меркаваннях дзяржаўнай бяспекі. Некаторыя мясцовыя ўлады таксама абмяжоўвалі права рэлігійнай свабоды на практыцы. Міжканфесіная варожасць паміж мусульманамі і хрысціянамі заставалася высокай у некаторых рэгёнах краіны, адбыўся шэраг канфліктаў на этна-рэлігійнай глебе. Ёсць факты дыскрымінацыі супраць рэлігійных меншасцяў. Пашырэнне сферы дзеяння законаў шарыяту выклікала сур'ёзныя спрэчкі ў грамадстве, якія тычыліся канстытуцыйнай правамоцнасці шарыяцкіх пакаранняў за злачынствы, такія як, напрыклад, ампутацыя рук за крадзёж, забойства камнямі за пазашлюбныя сувязі, збіццё палкамі за распусту і публічнае п'янства.

**Дыскрымінацыйнае заканадаўства альбо палітыка прыгнятання асобных рэлігійных канфесій**

Шэраг краін увялі ў дзеянне заканадаўствы або нарматыўныя акты, у якіх надаецца перавага адным адным рэлігіям за кошт другіх. Часта падобныя ўмовы з'яўляюцца вынікам гістарычнага панавання адной рэлігіі на тэрыторыі пэўнай краіны і выклікана недаверам насельніцтва да новых канфесій ці рэлігійных меншасцяў. Гэта часта здараецца ў краінах, дзе да апошняга часу панаваў камуністычны рэжым, пры якім любая рэлігійная дзейнасць была забаронена, або ў лепшым выпадку не знаходзіла падтрымкі ва ўладаў. У такіх краінах некаторыя слаі грамадства скептычна ставяцца і іншы раз са страхам да некаторых рэлігій. У многіх выпадках гэтыя абставіны прыводзяць да прыгнёту рэлігійнай свабоды.

**Беларусь.** Сітуацыя са свабодай веравызнання пагоршылася падчас складання гэтага даклада. 31 кастрычніка 2002 г. парламент, ігнаруючы бурнае ўнутранае і замежнае супрацьстаянне, зацвердзіў змены і дапаўненні ў закон «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях», які жорстка абмежаваў свабоду веравызнання нават для традыцыйных і прызнаных грамадствам канфесій – Беларускай праваслаўнай царквы, іудзеяў, мусульман, католікаў, лютэран. 12 чэрвеня урад і Беларуская праваслаўная царква (БПЦ), якая знаходзіцца пад юрысдыкцыяй Рускай праваслаўнай царквы, падпісалі Канкардат, які, на думку многіх, надае

перавагу БПЦ і прадстаўляе ёй правы і прывілеі, якіх не маюць іншыя канфесіі. Афіцыйныя ўлады працягвалі пераслед іншых канфесій і веравызнанняў. Так, неаднаразова было адмоўлена ў рэгістрацыі шэрагу прытэстанцкіх канфесій, Беларускай праваслаўнай аўтакефальнай царкве (БПАЦ) і некаторым усходнім рэлігіям. Улады працягвалі выконваць Указ Кабінета міністраў ад 1995 г., які абмяжоўвае дзейнасць рэілігійных дзеячаў у мэтах абароны праваслаўя на Беларусі і стрымлівання павелічэння ўплыву іншых канфесій. У перыяд, прадстаўлены ў дадзеным дакладзе, пратэстанты і іншыя рэлігійныя суполкі, якія не належалі да Рускай праваслаўнай царквы, працягвалі зведваць нападкі з боку кантралюемых дзяржавай сродкаў масавай інфармацыі.

**Бруней.** Спавядаючым немусульманскія вераванні не было дазволена займацца місіянерскай дзейнасцю, школам, заснаваным хрысціянскімі місіямі, не дазвалялася выкладаць хрысціянства. Усе школы, уключаючы 8 недзяржаўных кітайскіх школ і 3 хрысціянскіх, былі абавязаны выкладаць вучням асновы ісламу. Урад выкарыстоўваў шэраг муніцыпальных і зямельных законаў, каб абмежаваць рост прыхільнікаў любых рэлігій, апроч афіцыйнага ісламу. Урад выкарыстоўваў муніцыпальныя правілы раянавання, дзе абмяжоўваецца магчымасць выкарыстоўваць прыватныя дамы ў мэтах богаслужэння, каб адмовіць у рэгістрацыі і магчымасці правядзення калектўных набажэнстваў двум хрысціянскім суполкам.

**Эрытрэя.** Шанаванне свабоды веравызання працягвала пагаршацца на працягу справаздачнага перыяду. Урад пераслудваў, падвяргаў арыштам і турэмнаму зняволенню сяброў пратэстантскіх суполак, агульная назва якіх «Пэнтэс», рэфармісцкія накірункі коптскай царквы, «Сведкаў Іеговы» і вернікаў бахаі. Маецца вялікая колькасць паведамленняў аб пераводзе ў іншую веру і фізічных катаваннях вернікаў. Толькі 4 прызнаных урадам канфесіі - праваслаўныя хрысціяне, каталікі, мусульмане і прыхільнікі пратэстантскай царквы Эрытрэі - мелі магчымасць свабодна збірацца для набажэнстваў. Выконваючы пастанаўленне урада, прынятае ў траўні 2002 г., паводле якога ўсе рэлігійныя суполкі павінны прайсці рэгістрацыю, або іх дзейнасць будзе спынена, рэлігійныя аб'яднанні, якія не належалі да чатырох асноўных канфесій, былі зачынены. Урад адмовіў ім на прашэнне аб рэгістрацыі.

**Інданэзія.** Выкананне законаў шарыяту стала крыніцай для разгорнутых дэбатаў і ўсебаковага разгляду праблемы, падчас абмеркаванняў закраналіся шэраг выпадкаў, звязаных з уціскам свабоды веравызнання. З сакавіка 2002 г., згодна з дыкрэтам Прэзідэнта, улады пачалі прымяняць законы шарыяту ў правінцыі Ацэх. Некаторыя грамадзяне выказалі заклапочанасць тым, што выкананне законаў шарыяту прыдасць новыя сілы ўжо дыскрэдытаваўшым сваю дзейнасць органам аховы правапарадку і забяспечыць ураду магчымасць умяшальніцтва ў прыватную рэлігійную сферу. Да канца апісваемага перыяду не было зразумелым становішча з магчымасцю выкарыстання законаў шарыяту адносна немусульманскага насельніцтва некаторых правінцый. У чэрвені урад прыняў спрэчную пастанову ў галіне адукацыі, паводле якой кожны студэнт можа карыстацца правам навучання выкладчыкам адной з ім рэлігійнай прыналежнасці. Патрабаванне індывідуалізаванай рэлігійна скіраванай адукацыі

выконваецца урадам і рэлігійнымі школамі і выклікала пярэчанні у большасці хрысціянскіх і некаторых мусульманскіх суполак.

**Ізраіль і акупаваныя тэрыторыі.** У Ізраілі існуе прававая сістэма, якая прадугледжвае абарону ад рэлігійнай дыскрымінацыі. Аднак некаторыя неіудзеі працягвалі зведваць дыскрымінацыю ў такіх галінах грамадскага жыцця, як адукацыя, размеркаванне жылля, занятасць і іншыя сацыяльныя паслугі. Напрыклад, школы ў арабскіх раёнах, уключаючы арабскія парафіяльныя школы, атрымліваюць значна меншае фінансаванне, чым аналагічныя габрэйскія школы. Будаўнічыя нормы і дазвол на ўзвядзенне малельных будынкаў прымяняліся адвольна і ў залежнасці ад іх веравызнаўчай прыналежнасці. У перыяд, які ахоплены ў дадзеным дакладзе, працягвалася дыскрымінацыя арабскага насельніцтва на акупаваных Ізраілем тэрыторыях з боку ўлад і грамадства - у першую чаргу з-за здзяйснення палестынцамі (у асноўным, самазабойцамі) тэрарыстычных актаў і вайсковых дзеянняў улад на акупаваных тэрыторыях, якія прывялі да ўзнікнення пэўных цяжкасцей у рэлігіным жыцці. Выключны кантроль рэлігійных органаў улад, якія сфарміраваны ў асноўным з прадстаўнікоў артадаксальнага накірунку іудаізму, за шлюбамі, разводамі і большасцю пахаванняў, з'явіліся прычынай сур'ёзных канфліктаў у грамадстве. Хрысціяне-евангелісты, «Сведкі Іеговы», а таксама прадстаўнікі рэфармісцкага і кансерватыўнага накірункаў іудаізму скардзіліся на перасле, пагрозы, акты вандалізму ў дачыненні іх дамоў і іншых аб'ектаў.

**Малазія.** Іслам з'яўляецца афіцыйнай рэлігіяй, у той жа час канстытуцыя забяспечвае права свабоды веравызнання. урад разглядае суніцкую плянь ісламa як этнічную рэлігію малайцаў, адпаведна сунітскія ісламскія законы распаўсюджваюцца на этнічных малайцаў, якія складаюць прыблізна 55 адсоткаў насельніцтва. Урад працягваў ажыццяўляць кантроль над дзейнасцю шыіцкай меншасці, пры гэтым перыядычна затрымліваліся члены суполак, якія лічацца ісламскімі “адступніцкімі сектамі”, г.зн. суполкі, якія не спавядаюць афіцыйнага суніцкага вучэння без суда і прад’яўлення абвінавачання. Для мусульман права пераходу з ісламу ў іншую рэлігію з’яўляецца складаным пытаннем, і на практыцы было вельмі цяжка змяніць рэлігію. У цэлым, урад захоўваў права немусульман на спавяданне сваіх рэлігій. Аднак органы дзяржаўнай улады пастаянна ажыццяўлялі кантроль будаўніцтва ўсіх немусульманскіх месцаў пакланення і выдзялення зямельных участкаў пад немусульманскі цвінтар.

**Малдова.** Улады Прыднястроўя - некантралюемага урадам сепаратысцкага рэгіёна - працягвалі выконваць патрабаванне абавязковай рэгістрацыі, што негатыўна ўплывала на рэлігійныя суполкі, а таксама падвяргалі некаторыя з іх афіцыйнаму пераследу. На міжнародна прызананай і кантралюемай урадам частцы тэрыторыі Малдовы дзяржаўнай рэлігіі не існуе. Аднак Малдаўская праваслаўная царква карыстаецца асаблівай пашанай з боку урада. Улады адмовілі ў рэгістрацыі некаторым рэлігійным суполкам, такім як Духоўная арганізацыя мусульман. Да пазітыўных зрухаў можна прылічыць унясенне змен у закон «Аб свабодзе веравызнання», якія спрашчаюць працэс рэгістрацыі рэлігійных арганізацый і пасля 10 лет улады

нарэшце зарэгістравалі Бесарабскую мітраполію (Бесарабскую праваслаўную царкву).

**Расія.** Палітыка урада ў асноўным працягвала заставацца скіраванай на забеспячэнне рэлігійных свабод, аднак шэраг федэральных ведамстваў і некаторыя мясцовыя ўлады абмяжоўвалі правы рэлігійных меншасцяў. Юрыдычныя перашкоды для рэгістарцыі ў адпаведнасці з дапускаючым неадназначную трактоўку законам «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных аб'яднаннях» 1997 г., які ўносіць сур'ёзныя перашкоды ў дзейнасці рэлігійных суполак, за перыяд, адлюстраваны ў дакладзе, аслаблі. Аднак шэраг палажэнняў закона законам «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных аб'яднаннях» 1997 г. забяспечваў аснову для дзеянняў па абмежаванню свабоды веравызнання для некаторых суполак. У прыватнасці, больш за ўсё праблем выклікалі палажэнні, рэгламентуючыя дазвол дзяржаўным органам забараняць тыя ці іншыя рэлігійныя арганізацыі, неабходнасць перарэгістрацыі і парадак ліквідацыі рэлігійных суполак. Крытыкі таксама спасылаліся на палажэнні, якія не толькі абмяжоўваюць правы рэлігійных суполак, але прадугледжваюць наданне статуса «арганізацыі» тым суполкам, якія існуюць на працягу як мінінмум 15 гадоў, як на ствараючыя перашкоды дзейнасці некаторыхператэстанцкіх суполак хрысціян-евангелістаў. Таксама назіраліся прыкметы таго, што службы бяспекі схільныя разглядаць шэраг малакольkасных рэлігійных суполак, асабліва калі яны знаходзяцца ў кантакце з замежжам, у якасці пагрозы бяспецы краіны. Пачынаючы з лістапада 2002 г., калі быў прыняты новы закон «Аб іншаземцах» і папраўкі да яго, рэлігійныя дзеячы паведамлялі аб праблемах з атрыманнем уязных віз тэрмінам больш чым на 3 месяцы. Улады адмаўлялі ў выдачы віз ці анулявалі візы некаторых святароў-пратэстантаў, Далай-ламы і шэрага святароў Рыма-каталіцкай царквы, а таксама для біскупа 40 тысяч католікаў на Далёкім Усходзе. Многія дзяржаўныя чыноўнікі і шэраг другіх асоб працягвалі атаясамліваць праваслаўе з расійскай дзяржаўнасцю, даступная інфармацыя дазваляе зрабіць вывады аб наяўнасці ў Рускай праваслаўнай царквы прывілеяў адносна іншых канфесій. Паведамлялася, што шэраг дзяржаўных чыноўнікаў, пад уздзеяннем епархіяльных уладаў РПЦ, з якімі мелі цесныя стасункі, або проста адмаўлялі ў рэгістарцыі іншым рэлігійным суполкам, або перашкаджалі гэтаму. Некаторыя органы мясцовага кіравання таксама не дазвалялі рэлігійным суполкам зборы ў спецыяльна адведзеных для гэтага месцах і або адмаўлялі ў дазволе на пабудову храмаў або анулявалі раней выданы дазвол.

**Турцыя.** Працягваліся спрэчкі адносна дзяржаўнага азначэння “антыклерыкалізм”, які разглядаецца Урадам як гістарычная і сучасная неад’емная ўласцівасць ролі рэлігіі ў грамадстве. Абмежаванні тычыліся немусульманскіх рэлігійных суполак і адпраўлення рэлігійных немусульманскіх культаў ва ўрадавых установах і падкантрольных дзяржаве інтсытутах, звычайна з-за імкнення урада захаваць свецкую дзяржаву. Улады настойваюць на выкананні забароны насіць рэлігійнае мусульманскае адзенне ў дзяржаўных установах, у тым ліку універсітэтах, школах і на працоўных месцах. Шэраг мусульман, хрысціян і паслядоўнікаў веры бахаі цярпелі выпадковыя пераследы, уключаючы затрыманні за місіянерскую дзейнасць і правядзенне несанкцыянаваных сходаў.

**Ганьбаванне асобных канфесій шляхам іх неправамернага атаясамлення з небяспечнымі "культамі" альбо "сектамі"**

У Заходняй Еўропе захоўвалася тэндэнцыя да прыняцця дыскрымінацыйных законаў і правядзення палітыкі, накіраванай на ганьбаванне некаторых рэлігійных меншасцяў шляхам прылічэння іх да "культаў".

**Бельгія**. Некаторыя рэлігійныя суполкі, уключаныя ў неафіцыйны спіс, складзены парламентам у 1997, працягваюць сцвярджаць, што вынікам прысутнасці ў гэтым спісе з'явіліся дыскрымінуючыя ў стасунках да іх дзеянні. У ліпеньскім дакладзе Міжнароднага Хельсінкскага камітэта па правах чалавека за 2003 г. сцвярджаецца, што Парламент Бельгіі не прыняў ніякага працідзеяння у адказ на праявы варожага стаўлення і дыскрымінаванне сяброў рэлігійных суполак, прылічаных да "сект".

**Францыя**. Некаторыя назіральнікі занепакоеныя законам Абу-Пікара 2001 г., аднак, ні адна са спраў не падпала пад яго дзеянне. У лістападзе 2002 г. Савет Еўропы прыняў рэзалюцыю, заклікаючую Парламент Францыі пераглядзець закон Абу-Пікара і удакладніць некаторыя тэрміны ў ім. Шэраг рэлігійных суполак, уключаных у 1996 г. у парламенцкі спіс сектаў працягваюць зведваць уціск і дыскрымінацыю.

**Германія**. Федэральны дэпартамент аховы канстытуцыйных правоў (ДАКП) і многія мясцовыя ДАКП працягваюць назіранне за сябрамі саенталагічнай суполкі, нягледзячы на тое, што ні гэтая канфесія, ні яе прыхільнікі не былі заўважаны ў крымінальных дзеяннях на працягу апошніх 6 гадоў, калі за імі вядзецца кантроль. Прычынай, на якую спасылаецца Парламент пры ажыццяўленні кантролю за суполкай, з'яўляецца тое, што, на думку Парламента, саентолагі ўяўляюць сабой пагрозу дэмакратычнаму канстытуцыйнаму ладу. У жніўні 2002 г. Міністэрства ўнутраных спраў прадоўжыла іміграцыйную дыскрымінацыю (адказ у выдачы гасцявой візы) супраць фундатара Царквы Задзіночання прападобнага Сун-Мён Муна і яго жонкі Хак-Джа Хаш Мун. Мужу і жонцы было адаўлялі ва ўездзе ў краіну (і згодна з Шэнгенскім пагадненнем адмова расаўсюджвалася на іншыя краіны Шэнгенскай зоны) пачынаючы з 1995 г., калі Галоўнае ўпраўленне па ахове дзяржаўных межаў выдала пастанаўленне аб забароне перасякаць мяжу Германіі тэрмінам на 3 гады. Афіцыйнай прычынай візавага адказу было тое, што прападобны Мун і яго жонка разглядаліся федэральнымі ўладамі як лідэры "секты", дзеянне якой насе пагрозу асабістаму і сацыяльнаму развіццю маладых людзей, і, такім чынам, іх з'яўленне на тэрыторыі краіны не будзе адпавядаць захаванню нацыянальных інтарэсаў. Урад забараніў уезд на тэрыторыю краіны паўторна, Германія такім чынам апынулася адзінай еўрапейскай дзяржавай, якая прадоўжыла на 2 гады забарону, выдадзеную ў жніўні мінулага году, выкарыстоўваючы для адмаўлення толькі сарпаўдныя падставы.

**Раздзел II: Значнае паляпшэнне ў сферы выканання свабоды веравызнання**

Адпаведна "Закону аб міжнароднай рэлігійнай свабодзе" рэзюмэ дакладу павінна змяшчаць раздзел, у якім прыводзіцца спіс краін, у якіх заўважана "значнае паляпшэнне ў сферы аховы і развіцця" свабоды веравызнання; і змяшчаць апісанне характару паляпшэння, а таксама аналіз фактараў, якія дазволілі яго забяспечыць.

**Казахстан.** Агульны стастус свабоды веравызнання ў Казахстане палепшыўся на працягу закранаемага ў дакладзе перыяду. Прэзідэнт Назарбаеў высунуў ініцыятыву па развіцці дыялога паміж канфесіямі. У лютым прайшла міжнародная канферэнцыя з удзелам высокапастаўленых чыноўнікаў і духавентсва. Аднак услед за вынесеным на Канстытуцыйным сходзе ў красавіку 2002 г. рашэннем аб тым, што рэакцыйныя змены ў нацыянальным законе “Аб рэлігіі” не адпавядаюць Канстытуцыі, ніякіх захадаў па ўдасканаленні заканадаўчай базы не было зроблена. Выпадкі праследу рэлігійных арганізацый мясцовымі ўладамі, уключаючы судовыя працэсы супраць сўполак баптыстаў і “Сведкаў Іеговы” знізіліся ў час, ахоплены дадзеным дакладам.

**Лаос.** Нягледзячы на тое, што урад Лаоса працягваў агульнае абмежаванне адпраўлення рэлігійнай практыкі, ім былі дасягнуты і некаторыя значныя паляпшэнні. У большасці правінцый панізіўся ўзровень арыштаў рэлігійных лідэраў, адсутнічаюць паведамленні аб закрыцці цэркваў і іншых актах нецярпімасці адносна хрысціянскіх меншасцяў, такія як высылка ў сельскую мясцовасць, абмяжоўваліся некалькімі выпадкамі ў правінцыях. У дадатак, некалькі надоўга зачыенных цэркваў, асабліва ў правінцыі В’енц’ян былі адчыненыя. Урад прыкладаў сапраўдныя намаганні па дасягненні міру паміж канфесіямі і выказаў большую талерантнасць у дачыненні Евангелістскай царквы Лаоса. Урадавыя чыноўнікі аб’язджалі правінцыі з інспекцыяй праяў неталерантнасці ў дачыненні хрысціянскіх меншасяў, пры гэтым мясцовыя ўлады атрымлівалі інструкцыі паважаць права хрысціянскіх кангрэгацый на адпраўленне рэлігійных абрадаў, якое гарантуецца лаоскім заканадаўствам. Некалькі разоў вышэйшыя чыноўнікі Палітбюро наведвалі правінцыі і рэкамендавалі мясцовым уладам з большай пашанай ставіцца да адпраўлення рэлігійных практык хрысціянскімі меншасцямі.

**Раздзел III: Дзеянні ЗША па абароне свабоды веравызнання.**

Абарона сабоды веравызнання з’яўляецца адной з галоўных мэт знешняй палітыкі ЗША і афіцыйныя прадстаўніцтвы ЗША за мяжой актыўна ўдзельнічаюць у гэтай праваабарончай дзейнасці. Па ўсім свеце нашы замежныя дыпламатычныя місіі адыгрываюць вядучую ролю ў абароне права на свабоду веравызнання і аказваюць процідзеянні парушэнням гэтага права. Аднолькава істотныя і тон і кантэкст выказванняў высокапастаўленых чыноўнікаў ЗША падчас публічных выступленняў на тэму свабоды веравызнання або падчас вядзення ім і канфідэнцыяльных бясед з главамі замежных урадаў і іншымі палітычнымі дзеячамі.

Прэзідэнт Буш ясна даў зразумець, што лічыць свабоду веравызнання адным з фундаментальных і неад’емных правоў чалавека і неаднаразова падкрэсліваў значнасць ролі ЗША ў абароне гэтай фундаментальнай свабоды. У кастрычніку 2002 г. Прэзідэнт Буш сустрэўся з тагачасным

кіраўніком Кітая Цзян Цземінем і заклікаў яго праявіць большую талерантнасць да рэлігій Кітая, паўтарыўшы тым самым заклік, з якім Прэзідэнт выступіў у лютым таго ж года ў Пекіне. Абвясціўшы 16 студзеня Днем свабоды веравызнання ў ЗША, Прэзідэнт сказаў: “Права верыць і выражаць сваю веру словам і справай павінна належаць кожнаму”.

Дзяржаўны сакратар ЗША Колін Паўэл часта звяртаў увагу на пазітыўны ўплыў рэлігійнага плюралізму ў ЗША. 10 лютага ў інтэв’ю “Аль-Ахрам” ён паўтарыў гэты тэзіс, падкрэсліўшы “моц усіх рэлігій свету, калі яны аб’ядноўваюцца ва ўмовах міру”. Намеснік Дзяржсакратара Рычард Армітадж узнімаў пытанні свабоды веравызнання ў перамовах з афіцыйнымі прадстаўнікамі Кітая пры падрыхтоўцы да саміта. На 59-й сесіі Камісіі ААН па правах чалавека ЗША падтрымалі рэзалюцыю аб свабодзе веравызнання, уключаючы мандат спецыяльнага дакладчыка па праблемах рэлігійнай нецярпімасці. На гэтай жа сесіі амбасадар Джын Кірпатрык асудзіла парушэнні свабоды веравызнання ў Іране, Іраку, Кітаі, Беларусі і Судане.

Падчас снежаньскага Амерыкана-Кітайскага дыялогу па праблемах правоў чалавека, што адбыўся ў Пекіне і Сінцзян-Уйгурскім аўтаномным раёне, памочнік Дзяржсакратара па пытаннях дэмакратыі, правоў чалавека і працы Лорн Крэйнер і амбасадар па асобых даручэннях па пытаннях свабоды веравызнання Джон Хэнфард падкрэслівалі важнасць праблемы свабоды веравызнання паміж дзвюма краінамі. У перыяд, адлюстарваны ў дадзеным дакладзе, супрацоўнікі Бюро Дзярждэпартамента па пытаннях свабоды веравызнання за мяжой наведалі шэраг краін, уключаючы Азербайджан, Беларусь, Кітай, Егіпет, Грузію, Індыю, Італію, Расію, Узбекістан, Судан і В’етнам з мэтай падтрымкі свабоды рэлігіі.

“Закон аб міжнароднай рэлігійнай свабодзе” 1998 г. упаўнаважвае Прэзідэнта на прыняцце мераў у выпадках асабліва грубых парушэнняў свабоды веравызнання. Так , у сакавіку 2003 г. Дзяржаўны сакратар, дзейнічаючы па даручэнні Прэзідэнта, зноў уключыў шэсць краін – Бірму, Кітай, Іран, Ірак, Паўночную Карэю і Судан – да "краін, якія выклікаюць найбольшую заклапочанасць" на падставе закона за дапушчаныя парушэнні свабоды веравызнання.

#### Кароткая гадавая справаздача

Дадзены раздзел адлюстроўвае захады, якія  прадпрымаліся урадам ЗША ў шэрагу краін. Больш падрабязную інфармацыю па кожнай з краін можна знайсці ў прысвечаных гэтым краінам дакладах.

**Афганістан**.  Амбасадар ЗША разам з Высокім прадстаўніком і іншыя чыноўнікі Урада ЗША пераканалі афганскія ўлады уключыць абарону права на свабоду веравызнання ў Канстытуцыю. Прадстаўнікі амбасады ЗША неаднаразова праводзілі сустрэчы з прадстаўнікамі канфесій і рэлігійных меншасцяў, дзе абмяркоўваліся пытанні палітычных, юрыдычных, рэлігійных і правы чалавека ва ўмовах аднаўлення дзяржавы. ЗША таксама супрацоўнічалі з грамадскімі арганізацыямі па падтрымцы рэлігійнай талерантнасці. Грант амбасады ЗША быў выкарыстаны на выданне ў

Кабуле часопіса, у якім бы адлюстроўваліся праблемы “рэлігійнага дэспатызму” і прапагандавалася талерантнае тлумачэнне ісламу.

**Беларусь**. У катрычніку Дэпартамент накіраваў свайго прадстаўніка ў Мінск для заяўлення пратэсту супраць прыняцця абмяжоўваючага свабоду веравызнання закона. У лістападзе Дзяржадэпартамент прадставіў публічнае заяўленне з крытыкай прыняцця закона і яго асобных жорсткіх абмяжоўваючых палажэнняў. Амбасада ЗША выпусціла заяўленне, дзе выказваецца заклапочанасць прыняцем закона, і утрымлівае зварот да Урада, у якім нагадвае пра правы гармадзян на свабоду веравызнання. Крытычнае стаўленне дэлегацы ЗША у АБСЕ да нізкага ўзроўню рэлігійных свабод выкладзена ў заяўленні кастрычніка 2002 г.

**Боснія і Герцэгавіна.** Амбасадар ЗША неаднаразова праводзіў асабістыя і калектыўныя сустрэчы з рэлігійнымі лідэрамі, абмяркоўваючы стрыманасць, неабходную у мультыкультурным грамадстве. Амбасадар актыўна ўдзельнічаў у заснаванні Фундацыі, сродкі якой пойдуць на пабудову Мемарыяльнага цэнтра і цвінтара ў мястэчку Патачары каля Срэбраніцы, дзе будуць пахаваныя ахвяры масавых забойстваў мусульман у 1995 г. Амбасада неаднаразова асуджала акты дыскрымінацыі і рэлігійнай нецярпімасці супраць рэлігійных супольнасцей і храмаў, а таксама заклікаў лідэраў усіх этнічных груп і членаў інтэрнацыянальнай супольнасці да публічнага асуджэння падобных дзеянняў. Агенцыя ЗША па міжнароднаму развіццю прапанавала прафінансаваць навучанне юрыстаў і суддзяў у галіне правоў чалавека і свабоды веравызнання у тым ліку.

**Бірма**. Супрацоўнікі Амбасады ЗША садзейнічалі пашэрэнню рэлігійных свабод сярод чыноўнікаў урада, грамадзян, студэнтаў, прадстаўнікоў замежных урадаў, СМІ і бізнеса. Адным з ключавых момантаў дзеянняў і публічных акцый Амбасады ЗША былі частыя сустрэчы з лідэрамі будыйскіх, хрысціянскіх, ісламскіх суполак, уключаючы лідэраў этнічных меншасцяў, слухачоў багаслоўскіх семінарый і іншых звязаных з рэлігійнай сферай арганізацый. Злучаныя Штаты спынілі аказанне двухбаковай дапамогі ўраду, прыпынілі выдачу ліцэнзій на экспарт зброі ў краіну, а таксама прыпынілі дзеянне агульнай сістэмы прэферэнцый і паслугі Экспартна-імпартнага банку па падтрымцы экспартных паставак ЗША ў краіну. Урад ЗША таксама прыпыніў фінасавыя паслугі Карпарыцыі прыватнага інвеставання за мяжой (КПІМ) па падтрымцы інвестыцый ЗША ў краіне; прыпыніў актыўнае садзейнічанне гандлю з краінай і адмяніла выдачу віз высокапастаўленым урадавым чыноўнікам і членам іх сем'яў. Урад таксама забараніў размяшчэнне новых інвестыцый у краіне фірмамі ЗША, выступіў супраць аказання любой дапамогі ўраду міжнароднымі фінансавымі арганізацыямі і заклікаў урады іншых краін прыняць аналагічныя меры. Новыя інвестыцыі ў краіну грамадзян ЗША забаронены з 1997 г. чацьвёрты справаздачны год Дзяржаўны сакратар прылічыў Бірму да катэгорыі "краін, якія выклікаюць асаблівую занепакоенасць" паводле "Закона аб міжнароднай рэлігійнай свабодзе" за надзвычайныя жорсткасці ў дачыненні абмежавання свабоды веравызнання.

**Кітай**. Дзяржадэпартамент ЗША, Амбасада ЗША і асабіста Генеральны консул прадпрымалі ўзгодненыя намаганні з мэтай пашырэння свабоды

веравызнання ў краіне, факусуючы ўвагу на жорсткім падаўленні свабод і падтрымліваючы пазітыўныя тэндэнцыі ў краіне. У шматлікіх выпадках Урад і Амбасада ЗША ў Пекіне пратэставалі супраць дзеянняў кітайскага ўрада па абмежаванні рэлігійных свабод і свабоды сумлення, такіх як арышты паслядоўнікаў секты Фалунь Гон, тыбетскіх буддыстаў, уйгурскіх мусульман у аўтаномным раёне Сіньцзян, а таксама святароў і прыхажан-хрысціян. Сакратар Дэпартамента па пытаннях дэмакратыі, правах чалавека і працы разам з амбасадарамм і Высокім прадстаўніком міжнароднай супольнасці суправаджалі правядзенне Амерыкана-Кітайскага дыялогу па праблемах правоў чалавека ў Пекіне. Пытанні свабоды веравызнання былі галоўным пунктам у нарадзе. Дэпартамент ЗША прыняў кітайскіх рэлігійных лідэраў і навукоўцаў па праграме Міжнароднага абмену ў ЗША, дзе яны на месцы змаглі ацаніць ролю рэлігіі ў амерыканскім грамадстве. Урад ЗША таксама забяспечыў прыезд экспертаў па пытаннях рэлігіі з ЗША для публічных выступаў на тэму ролі і месца рэлігіі ў амерыканскім жыцці і палітыцы.

У 2003 г. – у чацьверты раз – Дзяржаўны сакратар прылічыў Кітай да катэгорыі "краін, якія выклікаюць асаблівую занепакоенасць".

**Грузія**. Ураду ЗША не раз выказваў сваю занепакоенасць ў сувязі з праследаваннямі і нападзеннямі на прадстаўнікоў нетрадыцыйных рэлігійных меншасцяў падчас сустрэч з Прэзідэнтам Шэварднадзэ і іншымі высокапастаўленымі ўрадавымі чыноўнікамі, такімі, як спікер Парламента, міністры ўнутраных спраў і юстыцы. Прысутнасць чыноўнікаў Амбасады на судовым працэсе супраць адлучанага ад праваслаўнай царквы святара Васілія Мкалавішвілі, абвінавачанага за падбухторванне да нецярпімасці і насілля супраць рэлігійных меншасцяў, дала эфектыўны штуршок руху наперад. Прадстаўнікі Амбасады, уключаючы амбасадора, неаднаразова сустракаліся з прадстаўнікамі Урада, Парламента, Неўрадавых арганізацый і рэлігійных суполак абмяркоўваючы праблемы свабоды веравызнання. Вярхоўны прадстаўнік па справах свабоды веравызання ў краінах свету правёў сустрэчы з прадстаўнікаму Ураду, абмяркоўваючы спыненне рэлігійнай варожасці. У траўні наведвальнікі з Упраўлення па справах рэлігіі сустрэліся з членамі Урада, рэлігійнымі суполкамі, неурадавымі арганізацымі на прадмет праблем свабоды веравызнання і падкрэслілі неабходнасць спынення насілля на рэлігійнай глебе.

У траўні прадстаўнік Аддзела міжнароднай рэлігійнай свабоды Дзяржаўнага дэпартаменту, які наведаў краіну ў красавіку 2002 г., правёў сустрэчы з членамі ўрада, прадстаўнікамі розных рэлігійных канфесій і неўрадавымі арганізацыямі, на якіх ён падкрэсліў неабходнасць прыняцця ўрадам Грузіі мераў, што палажылі б канец насіллю на рэлігійнай глебе.

**Германія.** Статус саенталогіі быў прадметам шэрагам дыскусій за паказаны перыяд. Урад ЗША выказаў апасенні парушэннямі індывіддуальных правоў і свабод па прычыне рэлігійнай прыналежнасці і дыскрымінацыяй у сферы міднароднага гандлю, выкліканай фільтрацыяй замежных кампаній на прадмет іх сувязі з саенталогіяй. Прадстаўнікі дыпламатычнай місіі арганізавалі сутстрэчы саентолагаў і дзяржаўных чыноўнікаў, дзе былі зроблены першыя крокі ў наладжванні дыялогу паміж бакамі і падтрымана ініцыятыва прызначэння амбудсмана, адказнага па пытаннях

узаемадзеяння, да якога маглі б звяртацца як чыноўнікі Урада ЗША так і самі саентолагі для забеспячэння паўнавартаснага дыялогу аб статусе саенталогіі ў краіне.

У адказ на антысеміцкія злачынствы, члены дыпламатычнай місіі ЗША ўважліва сачылі за рэакцыяй Урада Германіі і выказалі пратэст Урада ЗША нарастанню антысемітызма. Прадстаўнікік дыпмісіі наладзілі кантакты з прадстаўнікаім габрэйскіх суполак і прадаўжалі назіранне за сферай антысеміцкіх дзеянняў.

**Індыя**. Амбасада ЗША працягвала абараняць свабоду веравызнання, кантактуючы з высокапастаўленымі чыноўнікамі краіны, а таксама дзяржаўнымі і мясцовымі чыноўнікамі. Амбасада ЗША і прадстаўнікі Консульстваў рэгулярна праводзілі сустрэчы з рэлігійнымі лідэрамі ўсіх заўважных рэлігійных меншасцяў, а таксама з прадстаўнікамі неўрадавых арганізацый і паведамлялі пра выпадкі і тэндэнцыі ўціску рэлігійных свабод. У траўні 2002 г. прадстаўнік Дзяржаўнага ўпраўлення па справах рэлігіі наведаў Гуджарат, Мумбаі, Чэннаі і Дэлі з мэтай абмеркавання статуса рэлігійных свабод у краіне.

У сувязі з ажыццяўленнем актаў міжканфесіянальнага насілля ў Гуджраце, Пасол і іншыя высокапастаўленыя прадстаўнікі Адміністрацыі выказалі і перадалі свае спачуванні ахвярам насілля, а таксама заклікалі ўсе бакі да вырашэння рознагалоссяў мірным шляхам. Акрамя таго, місія Агенцтва ЗША па міжнароднаму развіццю (USAID) ў Нью Дэлі выдзяліла фінансавыя сродкі для аказання дапамогі перамешчаным асобам у Гуджараце. Генеральны консул у Мумбаі неаднаразова наведваў Ахмедабад, буйнейшы горад штата Гуджарат, дзе сустракаўся з афіцыйнымі і прыватнымі асобамі з мэтай высвятлення прычын і наступстваў насілля. У сувязі з прадаўжэннем масавых беспарадкаў іншыя супрацоўнікі Генеральнага консульства ў Мумбаі таксама ажыццяўлялі паездкі ў штат з мэтай ацэнкі сітуацыі і расследавання абвінавачанняў у парушэнні правоў чалавека. Супрацоўнікі консульства падчас ажыццяўлення маніторынгу наступстваў насілля ў Гуджараце таксама правялі шэраг сустрэч у Мумбаі з прадстаўнікамі неўрадавых арганізацый, дзелавых колаў, сродкаў масавай інфармацыі, уключаючы мусульманскіх лідэраў. Супрацоўнікі Консульства ЗША ў Чэннаі таксама праявілі актыўнасць у дапамозе місіянеру Джозэфу Куперу, калі на таго было здзейснена нападзенне індуістскімі экстрэмістамі. Чыноўнікі ЗША працягваюць падштурхоўваць мясцовыя ўлады да поўнага выканання законаў супраць пераводу ў іншую веру.

**Інданэзія**. Урад ЗША прадставіў гранты мясцовым і міжнародным арганізацыям на дапамогу інданезійскаму ураду ў падтрымцы ахвяраў міканфесіянальнага насілля, асабліва тым, хто быў змушаны пакінуь месца жыхарства ў выніку рэлігійных канфліктаў. Праз Азіяцкую фундацыю Урад ЗША забяспечыў сродкамі Баку Баэ Малуку, мясцовую неўрадавую арганізацыю для аплаты паслуг юрыстаў мусульманамі і хрысціянамі Малуку ў вырашэнні рэлігійных канфліктаў. Таксама праз Фундацыю, Урад ЗША прадставіў фінансаванне “Дэсантара”, іншай неўрадавай арганізацыі, для забеспячэння абароны правоў рэлігійных меншасцяў у Цыгугур, Заходняя Ява, і для папярэджання там рэлігійных канфліктаў. ЗША

пашырылі праграму дапамогі мусульманскім суполкам, выбраўшы дзясяткі студэнтаў мусульманскіх навучальных устаноў і ўплывовых журналістаў для наведвання ЗША і адлюстравання ўбачаных прынцыпаў рэлігійнай свабоды ў ЗША па мусульманскім нацыянальным тэлебачанні.

**Іран**. Хаця ЗША не маюць дыпламатычных стасункаў з Іранам, Урад ЗША выказаў сваё негатыўнае стаўленне да палітыкі Урада адносна рэлігійных меншасцяў і іншых абмежаваннях свабоды веравызнання праз публічнае заяўленне, падтрымліваючы намаганні ААН і недзяржаўных арганізацый, а таксама дыпламатычныя ініцыятывы іншых дзяржаў, датычныя свабоды веравызнання ў Іране. Віцэ-спікер Дзярждэпартаменат ЗША неалькі разоў звяртаў увагу на сітуацыю вакол суполкі бахаі і Іудаістскай суполкі. Урад ЗША падштурхнуў урады іншых краін зрабіць падобныя заяўленні і звярнуцца на праблему выканання свабоды веравызнання падчас дыялога гэтых краін з іранскім Урадам.

У 2003 г. – чацверты год запар – Дзяржаўны сакратар залічыў Іран да катэгорыі "краін, якія выклікаюць асаблівую занепакоенасць".

**Ірак**. Напярэдаддні падзення рэжыма Саддама Хусейна ЗША не мелі дыпламатычных стасункаў з Іракам, такім чынам, было немагчымым абмеркаванне з Урадам абмежаванняў свабоды веравызнання і парушэнняў іншых правоў чалавека. На пачатку 2003 г. Дзяржаўны сакратар ЗША залічыў Ірак да катэгорыі "краін, якія выклікаюць асобую занепакоенасць" паводле Міжнароднага пагаднення аб свабодзе веравызнання за акты насілля рэжыма Садама Хусейна супраць рэлігійных свабод. Падобным чынам краіна характарызавалася ў 1999, 2000 і 2001 гг. Міжнародная кааліцыя пад кіраўніцтвам ЗША знішчыла вахабітскі рэжым апдчас Аперацыі па вызваленні Ірака 9 красавіка 2003 г.

З устанаўленнем Кааліцыйнага часовага кіраўніцтва ў траўні 2003 г., Урад ЗША абмяркоўваў істотнасць абароны рэлігійных свабод з гармадзянамі і рэлігійнымі лідэрамі усіх этнасаў і канфесій, якія ўдзельнічаюць у выпрацоўцы шляху да новай кантстытуцыйнай сістэмы. Часовыя Кааліцыйныя ўлады, якія аказваюць дапамогу ракскаму народу ў пабудове дэмакратыі, стварылі Урад, які паважае фундаментальныя правы ўсіх грамадзян, незалежна ад этнічнай прыналежнасці і рэлігіі. У красавіку прыблізна 1,5 млн. мусульман-шытаў удзельнічалі ў Ашура-хаджы.

**Лаос**. Амбасадор ЗША наведаў некаторыя праблемныя раёны каб асабіста перканацца ў стане свабоды веравызнання. Амбасадор і іншыя чыноўнікі горача настойвалі на выкананні рэлігійных свабод у цэлым і асобных момантах пераследу іх лаоскімі чыноўнікамі. Амбасада ЗША арганізавала правядзенне дзейснага дыялогу з Міністэрствам унутраных спраў і Лаоскім фронтам нацыянальнага будаўніцтва і праінфармавала чыноўнікаў аб выпадках пераследу і ўціску на рэлігійнай глебе. Амбасада забяспечыла прыезд членаў Кангрэса і падтрымала намаганні ў абмеркавання пытанняў выканання свабоды веравызнання ў Лаосе.

**Нігерыя**. Чыноўнікі Амбасады ЗША ржгулярна абмяркоўвалі праблему рэлігійных сабод з федэральнымі. Дзяржаўнымі і мясцовымі ўладамі, а таксама з вядомымі грамадзянамі, уключаючы мусульманскія і хрысціянскія

суполкі. Урад ЗША праз Амбасаду ЗША і заяўленнях афіцыйных асобаў у Вашынгтоне працягваў падтрымліваць мірнае ўрэгуляванне праблемы ўжывання законаў шарыяту і заклікаць да выканання правоў чалавека і свабоды веравызнання.

Аддзел ініцыятыў пераходнага перыяду сумесна з USAID таксама падрыхтавалі праграмы навучання метадам урэгулявання канфліктаў. Пасольства арганізавала візіт выканаўчага дырэктара Амерыканскага мусульманскага савету з мэтай абмеркавання пытанняў выканання свабоды веравызнання ў Злучаных Штатах з прадстаўнікамі мусульманскай і хрысціянскай суполак у Абуджы, Лагосе і шэрагу гарадоў на поўначы краіны. Амбасада працягвала выдаваць інфармацыйны часопіс на хаусе, мове большасці мусульманскага насельніцтва на поўначы. У снежні, як частка праграмы па сувязях з мусульманскім духоўнымі лідэрамі, Эмір Кано арганізаваў сустрэчу прадстаўнікоў Амбасады ЗША і мусульманскіх духоўных лідэраў ан прадмет ісламу, нізкага ўзароўню паляпшэнняў свабоды веравызнання і іншых момантаў урадавай палітыкі.

**Паўночная Карэя**. ЗША не маюць дыпламатычных стасункаў з Карэйскай Народнай Дэмакратычнай Рэспублікай, аднак палітыка ЗША скіраваная на падтрымку развіцця свабоды веравызнання ў краіне. Падчас размовы ў Пхеньяне ў кастрычніку 2002 г. Дапаможны сакратар па справах Усходняй Азіі і Ціхаакеанскага рэгіёна Дэймс А. Кэллі падкрэсліў дрэнны стан правоў чалавека і рэлігійных свабод. ЗША неаднаразова выказвалі падобнае стаўленне на шматбаковых сустрэчах з урадамі іншых краін. Чыноўнікі Урада ЗША падштурхоўваюць урады іншых краін да пабудовы двухбаковых стасункаў з Паўночнай Карэяй на падставе канкрэтных, доказных і значных паляпшэнняў сітуацыі з правамі чалавека. На 59-й сесіі Камісіі ААН па правах чалавека дамагаўся прыняцця рэзалюцыі адносна правоў чалавека ў Паўночнай Карэі, уключаючы дрэнны стан свабоды веравызнання. палітыка ЗША дазваляе гармадзянам ЗША прыезд у краіну і шэраг канфесій і ржлігійных суполак прыкладаюць намаганні каб забяспечыць краіну неабходнымі прадуктамі і медыкаментамі.

У 2003 г. Дзяржаўны сакратар зноў залічыў Паўночную Карэю да катэгорыі "краін, якія выклікаюць асобую занепакоенасць".

**Пакістан.** Амерыканскія чыноўнікі прысутнічалі на некаторых судах над асобамі, якія абвінавачваюцца ў блюзнерстве, як, напрыклад, доктар Йоніс Шэйх. І падтрымалі правядзенне расследаванняў чыноўнікамі ўрада інцыдэнтаў з узрывамі цэркваў. Амбасада таксама аказвала садзеянне мясцовым праваабарончым арганізацыям ў давядзенні да канца расследаванняў адносна спецыфічных рэлігійных меншасцяў. У рамках міжнароднай праграмы абмену, Амбасада прафінансавала паезку некалькіх навукоўцаў у ЗША з мэтай удзелу ў праграмах, звязаных са свабодай веравызнання і рэлігійным плюралізмам. ЗША настойліва папярэдзілі Урад аб некаторых экстрэмістскіх элементах навучання ў медрэсэ.

**Расія.** Амерыканскія чыноўнікі неаднаразова мелі сустрэчы з Урадам, настойваючы на выкананні рэлігійных свабод. Консульствы павялічылі выдачу віз для рэлігійных дзеячаў Паспартна-візавай службай Міністэрства ўнутраных спраў і Міністэрства замежных спраў. Супрацоўнкік амбасады

таксама сутсракалісь з прапаведнікамі падчас паездак у глыб краіны. 20 студзеня Амбасадор меў сустрэчу з Міністрам юстыцыі Юрыем Чайка і выказаў заклапочанасць непаслядоўнасцю патрабаванняў да рэгістрацыі рэгіянальнымі органамі Міністэрства. У лістападзе Старшыня дэпутацкай місіі прыняў каля 50 рэілігійных дзеячаў і чыноўнікаў па праблеме свабоды веравызнання. у кастрычніку і траўні чыноўнік з Вашынгтона, адказны за выканне рэлігійных свабод, сустрэўся ў Маскве з рэлігійнымі і праваабарончымі групамі. 17 літстапада 11 членаў Хельсінкскга камітэта і 6 членаў Кангрэса зваярнуліся з настойлівым зваротам да Прэзідэнта Пуціна, гаворачы аб недапушчальнасці дыскрымінацыі па рэлігійных матывах пры выдачы віз для замежных рэлігійных дзеячаў, прадстаўнікоў рэілігійных меншасцяў. У снежні адпаведна з дзяржаўнай праграмай Міжнародных абменаў, звязанай з выкананнем рэлігійных свабод, расійскім мясцовым, рэгіянальным і федэральным чыноўнікам была прадстаўлена магчымасць наведаць ЗША па праграме “Пашырэнне дыялога і талерантнасці паміж народамі”.

**Судан**. Чыноўнікі Урада ЗША паяснілі Ураду Судана, што праблема выканання ржлігійных свабод з’яўляецца галоўнай перашкодай для падпісання пагадненняў паміж краінамі. Высокапастаўленыя амерыканскія чыноўнікі ЗША і місій пры міжнародных сустрэчах настойліва падкрэслівалі праблему свабоды веравызнання перад Урадам і гармадскасцю. Амбасадар Хэнфард сустрэўся з вышэйшымі чыноўнікамі Судана для ўзаемадзеяння ў галіне свабоды веарвызнання. Амбасада настойліва падкрэслівала важнасць праблемы як перад Урадам, так і перад Прэзідэнтам і Міністрам знешніх спраў. Амбасада ЗША і Дзярдэпартамент нстойліва падкрэслівалі праблему свабоды веравызання ў публічнай заяве і на міжнарожных форумах, уключаючы Камісію па правах чалавека. Спецыяльны Пасланнік міра ў Судане, Джон Дэнфард , сустррэўся з рэлігійнымі лідэрамі і настояў на рэлігійнай сабодзе. У кастрычніку 2002 г. прадстаўнік Упраўлення па справах свабоды рэлігіі сустрэўся з суданскімі рэлігійнымі лідэрамі ў Хартуме і Найробі для абмеркавання сітуацыі са свабодай веравызання ў краіне.

Дыпламатычныя намаганні ЗША па ўсталяванні міра ў краіне прадоўжыліся ў арганізацыі дыялогу па праблемах рэлігій. Амбасада ЗША заручылася падтрымкай такіх арганізацый як Царкоўны савет Судана, Міжрэлігійны савет Судана, а таксама падтрымлівала і развівала стасункі х рэлігійнымі лідэрамі мусульман і хрысціян.

У 2003 г. – трэці год запар – Дзяржаўны сакратар залічыў Судан да катэгорыі "краін, якія выклікаюць асобую занепакоенасць".

**Саудаўская Аравія.** Урад ЗША прадоўжыў палітыку ціску на Урад адносна павагі публічнага прыняцця дазволу на адпраўленне рэлігійнай практыкі немусульманскімі меншасцямі, спыненні дыскрымінацыі рэлігійных меншасцяў, і павелічэнні талерантнасці да немусульман. Амбасадор ЗША заклікаў да павелічэння цярпімасці да ржлігійных меншасцяў у краіне і супрацоўнікі Амбасады падчас сустрэч з Міністэрствам замежных спраў абмяркоўвалі Даклад аб сваболзе веравызнання ў краінах свету за 2002 г. Вышэйшыя чыны Амбасады заклікалі Урад паважаць правы мусульман, якія

спавядаюць несалафістскія накірункі ісламу. Вышэйшыя чыны Амбасады таксама выказалі пратэст супраць уварванняў у прыватныя дамы і затрыманні хрысціянскіх вернікаў у Эр-Рыядзе, паспяхова настойваючы на вызваленні некалькіх зняволеных-хрысціян у верасні 2002 г. Крад ЗША таксама садзейнічаў паляпшэнню умоў жыцця былога зняволенага-хрысціяніна, і той змог пазбегнуць пераследу пры вяртанні на месца былога пражывання.

**Туркменістан.** У лістападзе Амбасадор паведаміў Ураду аб вызваленні ў 2002 г. па прэзідэнтскай амністыі з турэмнага заняволення сябра "Сведкаў Іеговы" Курбана Закірава і іншых. Амбасадор і супрацоўнікі Амбасады распаўсюдзілі спецыяльнае заяўленне, дзе асуджалася і патрабавалася большая пашана да рэлігійных свабод. Падчас сустрэчы з Міністрам замежных спраў Амбасадор таксама распаўсюдзіў спецыяльны даклад і запатрабаваў спынення рэгістрацыі рэлігійных меншасцяў на падставе колькаснасці суполкі. Амбасадор і супрацоўнікі Амбасады рэгулярна праводзілі сустрэчы з супрацоўнікамі Арганізацыі па бяспецы і супрпрацоўніцтва ў Ашхабадзе і іншымі дыпламатычнымі місіямі, каб павялічыць сумесныя намаганні ў назіранні за парушэннямі рэлігійных свабод і забеспячэння большай павагі да іх выканання. Пры падтрымцы Дзярждэпартамента ЗША ў красавіку 2003 г. ААН распаўсюдзіла рэзалюцыю, якая асуджала насілле над правамі чалавека, уключаючы сваюоду веравызнання.

**Узбекістан.** Члены Кангрэса і іншыя высокапастаўленыя чыноўнікі заканадаўчай і выканаўчай галін улады ЗША сустракаліся з узбексткімі чыноўнікамі за мяжой і на тэрыторыі краіны, каб выразіць цвёрдую прыхільнасць ЗША курсу абароны правоў чалавека, уключаючы пазіцыю адносна правоў свабоды веравызнання і рэлігійнага самавыражэння. Амбасадар ЗША і іншыя супрацоўнікі Амбасады сустракаліся з мясцовымі рэлігійнымі лідэрамі, актывістамі-праваабароцамі і афіцыйнымі чыноўнікамі для абмеркавання спецыфічных пытанняў свабоды рэлігіі. Афіцыйныя асобы ў Вашынгтоне, уключаючы Высокага прадстаўніка, сутсракаліся з Амбасадорам Узбекістана ў ЗША, каб давесці стаўленне дзяржавы да свабоды веравызнання. чыноўнікі дэпартамента вандравалі па краіне, сустракаючыся з рэлігійнымі лідэрамі і рэлігійнымі суполкамі, а таксама прадстаўнікамі урада.

**В'етнам**. ЗША некалькі разоў публічна выказваліся адносна сітуацыі ў краіне са свабодай веравызнання. У свой прыезд у жніўні 2002 г. Амбасадор Ханфард сустаркаўся з высокапастаўленымі чыноўнікамі наконт зняволеных па рэлігійных матывах, умоваў з рэлігійнымі свабодамі ў Цэнтральных і Паўночна-Усходніх высакагорных правінцыях, абмежаванняў Будыйскай аб'яднанай царквы В'етнама (БАЦВ) і іншых абмежаванняў, з якімі сутыкаліся асноўныя рэлігійныя суполкі. У прадстаўленых Ураду Амбасадорам і іншымі супрацоўнікамі Амбасады і Генеральнага консульства звестках акцэнтуецца ўвага на прызнанні асноўных рэлігійных суполак, уключаючы сяброў БАЦВ, пратэстантскіх цэркваў, раскалоўшыхся суполак Хоахао і Каодай. Таксама была падкрэслена большая свабода прызнаных рэлігійных суполак. Падчас Дыялогу па правах чалавека ў лістападзе 2002 г. Амбасадар Хэнфард падкрэсліў большае кола рэлігійных свабод,

забяспечаных  В’етнамскімі ўладамі. Амбасада і Генеральнае консульства таксама спыніліся на спецыфічных перашкодах і абмежаваннях рэлігійных свабод. Супрацоўнікі Амбасады і Генеральнага консульства некалькі разоў сустаркаліся з прадстаўнікамі асноўных рэлігійных суполак, уключаючы сяброў БАЦВ, пратэстантскіх цэркваў, раскалоўшыхся суполак Хоахао і Каодай. У паездках па краіне супрацоўнікі Амбасады і Генеральнага консульства прадпрымалі асаблівыя намаганні для сустрэч з мясцовымі Камітэтамі па справах рэлігій, вясковымі старэйшынамі, мясцовым клірам і святарамі.

Распаўсюджана 18 снежня 2003 г.

## Беларусь

# Даклад аб свабодзе веравызнання ў краінах свету за 2002 г.

### Зроблены  Бюро па пытаннях дэмакратыі, правах чалавека і працы

Канстытуцыя гарантуе свабоду веравызнання, аднак рэжым абмяжоўвае ажыццяўленне гэтага права на практыцы.

Сітуацыя са свабодай веравызнання пагоршылася падчас складання гэтага даклада. 31 кастрычніка 2002 г. Урад, ігнаруючы бурнае ўнутранае і замежнае супрацьстаянне, зацвердзіў змены і дапаўненні ў закон «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях», які жорстка абмежаваў свабоду веравызнання 12 чэрвеня Урад і Беларуская праваслаўная царква (БПЦ), якая знаходзіцца пад юрысдыкцыяй Рускай праваслаўнай царквы, падпісалі Канкардат, які, на думку многіх, надае перавагу БПЦ і прадстаўляе ёй правы і прывілеі, якіх не маюць іншыя канфесіі. Афіцыйныя ўлады працягвалі пераслед іншых канфесій і веравызнанняў. Так, неаднаразова было адмоўлена ў рэгістрацыі шэрагу прытэстанцкіх канфесій, Беларускай праваслаўнай аўтакефальнай царкве (БПАЦ) і некаторым усходнім рэлігіям. Улады працягвалі выконваць Указ Кабінета міністраў ад 1995 г., які абмяжоўвае дзейнасць рэлігійных дзеячаў у мэтах абароны праваслаўя на Беларусі і стрымлівання павелічэння ўплыву іншых канфесій. У перыяд, прадстаўлены ў дадзеным дакладзе, пратэстанты і іншыя рэлігійныя суполкі, якія не належалі да Рускай праваслаўнай царквы, працягвалі зведваць нападкі з боку кантралюемых дзяржавай сродкаў масавай інфармацыі. Нягледзячы на прыцяглы ўціск, некаторыя веравызнаўчыя меншасці мелі магчымасць існаваць, калі яны не прыцягвалі шырокай увагі да сябе, у той час як іншыя публічна дэкларавалі сваё нежаданне праходзіць рэгістрацыю згодна з новым законам.

У асноўным, сярод зарэгістраваных традыцыйных рэлігійных суполак існуюць добрае стаўленне, аднак, на побытавым узроўні захоўваўся антысемітызм і працягвала ўзмацняцца негатыўнае стаўленне да рэлігійных меншасцяў.

Урад ЗША абмяркоўваў нездавальняючую сітуацыю з правамі чалавека і выкананнем рэлігійных свабод у краіне, а таксама шэраг канкрэтных

пытанняў з прадстаўнікамі ўраду, і Амбасада заклікала ўлады забяспечыць права беларускіх грамадзян на свабоднае веравызнанне.

## Раздзел I. Рэлігійная дэмаграфія

Плошча краіны складае 76 810 кв. міляў (207 600 кв. км), насельніцтва складае прыблізна 9 990 000 чалавек.

Тэрыторыя краіны гістарычна была арэнай узаемадзеяння, спаборніцтва і канфліктаў паміж грэчаскім праваслаўем і рымскім каталіцызмам. Рэпрэсіі з боку расійскіх а затым і савецкіх уладаў супраць Рыма-каталіцкай царквы прывялі да пераходу большасці насельніцтва ў Праваслаўную царкву, а яе культура ў значнай ступені секулярызаваная. Згодна з апытаннем грамадскай думкі, якое праводзілася ў 1998 г., менш за палову насельніцтва вераць у Бога і каля 60 адсоткаў аддае перавагу Праваслаўю па культурных і гістарычных прычынах. Урад зазнчае, што з тых, хто адкрыта спавядае якую-небудзь рэлігію каля 80 адсоткаў належаць да Беларускай праваслаўнай царквы і ад 15 да 20 адсоткаў вернікаў хутчэй за ўсё спавядаюць рыма-каталіцкую веру або ідэнтыфікуюць сваю рэлігійную прыналежнасць з Рыма-каталіцкай царквой (другой па значнасці рэлігійнай супольнасцю). Ад 50 000 да 90 000 лічаць сябе іудзеямі. Ёсць таксама пратэстанты і паслядоўнікі Грэка-каталіцкай царквы, а таксама Беларускай праваслаўнай аўтакефальнай царквы. Іншыя рэлігійныя меншасці ўключаюць, але не абмяжоваюцца наступным: індуісты, крышнаіты, бахаі, адвентысты сёмага дня, стараверы, мусульмане (муфціят, ліквідаваны ў 1939 г., быў адноўлены ў пачатку 1994 г.), “Сведкі Іеговы”, апостальскія хрысціяне, кальвіністы і лютэране. Невялікая суполка этнічных татар, карані якой у 11-м стагоддзі, спавядае іслам.

У 1989 г., калі краіна стала экзархатам Рускай праваслаўнай царквы, узнікла Беларуская праваслаўная царква. Пад кіраўніцтвам Патрыяршага Экзарха Філарэта колькасць праваслаўных прыходаў у краіне павялічылася да 1 265 да канца перыяду, які ахоплівае дазеная даклад. Па краіне налічваецца прыблізна каля 400 Рыма-каталіцкіх парафій. Традыцыйна рымска-каталіцкая суполка была больш шматлікай у заходніх і паўночных раёнах, якія знаходзіліся пад уплывам Польшчы, аднак колькасць польскай этнічнай суполкі, якая налічвае 400 000 чалавек, не адпавядае колькасці каталікоў, паколькі рымска-каталіцкія прыходы размешчаны ў розных рэгіёнах краіны. Усведамляючы небяспеку стаўлення да Рымска-каталіцкай царквы, як да "замежнай" альбо царквы, якая прадстаўляе палітычную пагрозу, Кардынал каталіцкай царквы на Беларусі стараецца не ўцягваць царкву ва ўнутраныя палітычныя праблемы. Хаця Кардынал забараніў выкарыстанне ў цэрквах польскіх нацыянальных сімвалаў і падтрымлівае выкарыстанне беларускай мовы падчас правядзення набажэнстваў, некаторыя святары працягваюць праводзіць богаслужэнні на польскай мове для польскамоўных вернікаў.

Па наяўных даных каля 120 тысяч грамадзян лічыліся грамадзянамі "габрэйскай нацыянальнасці" напрыканцы савецкага перыяду ў 1989 г., у параўнанні з іх колькасцю, якая складала ад 50 000 да 90 000 чалавек у перыяд, які ахоплівае дадзены даклад. Амаль палова габрэйскага насельніцтва жыве ў Мінску альбо ў яго наваколлі. Большасць габрэяў, што жывуць у краіне, не вызнаюць актыўна рэлігію. Большая частка з тых, хто

займаецца актыўным веравызнаннем, належыць, па ўсёй бачнасці, да рэфармісцкіх ці кансэрватыўных груп. У Мінску знаходзіцца невялікая, але актыўна дзейнічаючая артадаксальная сінагога Любавічаў. У 2002 годзе пры замежнай падтрымцы, у Мінску адкрыўся "Габрэйскі грамадскі цэнтр".

Хаця вернікі-пратэстанты і прадстаўляюць невялікую частку насельніцтва, іх колькасць працягвае павялічвацца. Па даных дзяржаўных і незалежных крыніц, за перыяд з 1999 г. колькасць зарэгістраваных і незарэгістраваных пратэстанцкіх кангрэгацый больш чым падвоілася, і зараз складае больш 1000. Пратэстанцкія канфесіі, якія з-за гістарычных прычын заўсёды былі невялікімі па колькасці, тым не менш дзейнічаюць у краіне на працягу некалькіх стагоддзяў. Дзве буйнейшыя пратэстанцкія групы зарэгістраваны асобна як аб'яднанні пяцідзесятнікаў і баптыстаў. Значная колькасць пратэстанцкіх цэркваў, уключаючы харызматычныя групы і групы пяцідзесятнікаў, застаюцца незарэгістраванымі.

У краіне ёсць таксама шэраг іншых кангрэгацый, такіх, як Грэка-каталіцкая царква, ці уніяцтва, якая калісьці была рэлігіяй большасці насельніцтва. Грэка-каталіцкая царква была заснавана ў XVI стагоддзі і калісьці яе прыхільнікі складалі тры чвэрці насельніцтва краіны. Яна была забаронена Расійкім урадам у 1839 г. і падвяргалася бязлітаснаму пераследу ў 1860-я гг., а затым у 1946 г. Пасля аднаўлення незалежнасці Беларусі ў 1991 г. спробы адрадзіць гэту царкву, якая выкарыстоўвае праваслаўныя абрады, але падначалена Ватыкану, не мелі значнага поспеху.

14 лістапада 2002 г. у выніку раскола Рэлігійнага задзіночання мусульман Беларусі, галоўнага арганізацыйнага цэнтра 30 000 беларускіх мусульман, была заснавана новая мусульманская арганізацыя - Духоўнае кіраўніцтва мусульман. Хаця, па сцвярджэннях Духоўнага кіраўніцтва мусульман, каля 90 адсоткаў мусульман належаць да новастворанай суполкі, гэтыя дадзеныя немагчыма пацвердзіць.

## Раздзел II. Становішча ў сферы свабоды веравызнання

*Юрыдычныя/палітычныя ўмовы*

Канстытуцыя гарантуе свабоду веравызнання; аднак рэжым, які існуе ў краіне, абмяжоўвае ажыццяўленне гэтага права на практыцы. Хаця змененая ў 1996 годзе Канстытуцыя пацвярджае прынцып роўнасці рэлігій і рэлігійных канфесій перад законам, яна таксама змяшчае абмежоўваючыя палажэнні, якія прадугледжваюць, што стасункі паміж дзяржавай і рэлігіямі "рэгулююцца законам з улікам іх уплыву на духоўныя, культурныя і гістарычныя традыцыі беларускага народа".

Прэзідэнцкім Указам ад 2001 г. Дзяржаўны камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пераўтвораны ў Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў (КСРН). КСРН рэгулюе ўсе рэлігіныя пытанні ў краіне.

31 кастрычніка 2002 г. Прэзідэнт Лукашэнка фармальна падпісаў змены і дапаўненні ў закон «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях», насуперак бурнаму ўнутранаму і замежнаму супрацьстаянню

праваабарончых арганізацый, Савета Еўропы і айчынных рэлігійных суполак, уключаючы праваслаўныя суполкі, якія не належаць да БПЦ. 27 чэрвеня 2002 г. Ніжняя палата парламенту канчаткова адобрыла новы закон аб рэлігіі. Нягледзячы на спробы выканаўчай улады, якія мелі месца, забяспечыць хуткае прыняцце закону, Верхняя палата адклала яго разгляданне да восені. Аднак, ужо ў 28 чэрвеня 2002 г. пад жорсткім націскам з боку Урада, Ніжняя палата склікала пазачарговую нараду і бальшынёй галасоў адобрыла законапраект. Галасаванне адбылося, нягледзячы на тое, што некаторыя дэпутаты не змаглі прысутнічаць. СМІ і прысутныя відавочцы паведамлялі, што дэбаты былі вельмі эмацыянальна напружаныя, некаторыя дэпутаты дазвалялі сабе выказванні блюзнерскага і антысеміцкага характару. Закон прызнае гістарычную ролю Рыма-каталіцкай царквы, артадаксальнага іудаізму, суніцкага ісламу і лютэранства, - супольнасцей, агульнапрызнаных як традыцыйныя канфесіі грамадства, роўным чынам як і «вызначальную ролю праваслаўнай царквы ў станаўленні і развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа».

Закон утрымлівае шэраг стрымліваючых палажэнняў, якія павялічваюць умяшальніцва дзяржавы ў дзейнасць рэлігійных суполак. Так, закон патрабуе атрымання усімі рэлігійнымі суполкамі папярэдняга заключэння рэлігійнай экспертызы наконт магчымасці ўвоза і распаўсюджвання рэлігійнай літаратуры ў краіне, а таксама забараняе замежным грамадзянам узначальваць рэлігіныя суполкі, і ў той жа час не дазваляе адчыняць свае рэлігійныя навучальныя ўстановы для падрыхтоўкі святароў. Законам прадугледжаны комплекс рэгістрацыйных патрабаванняў, якія будзе цяжка выканаць як традыцыйным, так і нетрадыцыйным рэлігійным суполкам. Закон загадвае ўсім рэлігійным арганізацыям прайсці абавязковую перарэгістрацыю ў двухгадовы тэрмін і прадугледжвае дзейсныя меры па забароне дзейнасці незарэгістраваных суполак. Шэраг зарэгістраваных рэлігійных суполак могуць не адпавядаць усім патрабаванням для перарэгістрацыі, аднак, улады публічна запэўнілі рэлігійныя арганізацыі ў тым, што ні адна з маючых рэгістрацыю падчас прыняцця закона суполак, не згубіць свайго статусу. У той час як лідэры некаторых малакольккасных рэлігійных суполак скептычна ставяцца да падобных сцвярджэнняў улад, за час падрыхтоўкі даклада Урад не скасаваў рэгістрацыю ні адной з папярэдне зарэгістраваных суполак.

БПЦ выключна станоўча ацаніла прыняты закон, які, па словах Мітрапаліта Філарэта "з'яўляецца дадатковай абаронай грамадзян ад дзеянняў псеўдарэлігійных сілаў і адчыняе новыя магчымасці сумеснага дзеяння дзяржавы і царквы". Такім чынам, КСРН заяшляе, што прыняцце закона было неабходнай мерай па абароне беларускага грамадства ад так званых "дэструктыўных і псеўдарэлігійных груп", якія, на думку урада, вельмі пашыраны ў краіне. У процілегласць падобнаму сцвярджэнню, урад не здолеў прадставіць доказаў існавання такіх груп. Хаця урад неаднаразова цытаваў ухваленні закона традыцыйнымі канфесіямі, апошнія выражалі занепакоенасць прыняццем нарматыўнага акта.

Закон устанаўлівае трохчасную структуру рэлігійных груп: рэлігійныя суполкі, рэлігійныя задзіночанні і Рэспубліканскія рэлігійныя арганізацыі.

Рэлігійныя суполкі, або мясцовыя аб’яднанні грамадзян, павінны мець у складзе не менш 20 сяброў, якія дасягнулі васемнаццацігадовага ўзросту і пастаянна пражываюць на суседніх тэрыторыях. Для рэгістрацыі рэлігійная суполка павінна прадставіць спіс заснавальнікаў, з указаннем імёнаў, прозвішчаў, імёнаў па бацьку, даты нараджэння, месца нараджэння, грамадзянства, месца жыхарства і асабістым подпісам; некалькі экзэмпляраў статута суполкі; пратакол заснавання суполкі; дакумент, які пацвярджае права на валоданне маёмасцю, пазначанай у статуце суполкі. Для суполак, якія вызнаюць раней не вядомыя на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь вераванні, павінна прыкладацца дадатковая інфармацыя аб сутнасці гэтых вераванняў. Згодна закона, усе прашэнні аб рэгістрацыі разглядаюцца Абласным выканаўчым камітэтам (для суполак па-за межамі Мінска) і Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам. Хаця закон забараняе рэлігійным суполкам ствараць адукацыйныя установы для навучання святароў, дазваляецца кіраванне нядзельнымі школамі.

Рэлігійнае задзіночанне ўтвараецца на аснове 10 рэлігійных суполак, з якіх адна ажыццяўляе сваю дзейнасць на тэрыторыі краіны не менш за 20 гадоў. Для рэгістрацыі заддзіночанне павінна прадставіць спіс членаў органа кіравання задзіночаннем з біяграфічнымі падаткамі, дакумент, які пацвярджае магчымасць размяшчэння рэлігійнага задзіночання па месцы знаходжання, статут і пратакол аб утварэнні задзіночання. Паводле закона, задзіночанні маюць выключнае права ствараць адукацыйныя ўстановы для навучання кліра, запрашаць іншаземцаў для дзейнасці ў адпаведным задзіночанні, а таксама ўтвараць манастырскія і манаскія ордэны.

Рэспубліканскае рэлігійнае задзіночанне ствараецца толькі пры ўмове, калі мае дзейсныя рэлігійныя суполкі ў большасці абласцей краіны. Па закону, усе прашэнні аб рэгістрацыі задзіночанняў і рэспубліканскіх задзіночанняў падаюцца на разгляд у КСРН.

12 чэрвеня Прэм’ер-міністр і Мітрапаліт Філарэт падпісалі Канкардат паміж БПЦ і Урадам. Канкардат гарантуе БПЦ аўтаномнае кіраванне і выкананне ўсіх рэлігійных правоў, як і права на асаблівыя стасункі з дзяржавай. Гэты акт прызнае за БПЦ “уплыў на фарміраванне духоўных, культурных і нацыянальных традыцый беларускага народа”. Канкардат прызваны садзейнічаць сумесным дзеяннем Урада і БПЦ у розных галінах, уключаючы адукацыю, падтрымку і абарону культурнай спадчыны і бяспеку. Хаця сцвярджаецца, што гэтае пагадненне не стане абмежаваннем рэлігійных свабод іншых канфесій, Канкардат прызваны садзейнічаць сумеснаму процістаянню Урада і БПЦ супраць неназваных “псеўдарэлігійных старуктур, якія з’яўляюцца пагрозай для асоб і грамадства ў цэлым”.

Урад, спасылаючыся на падобныя групы, разглядае рэлігійныя вераванні як “нетрадыцыйныя”, пры гэтым афіцыйныя масс-медыа таксама шырока выкарыстоўваюць тэрмін “секты”, калі адсылаюць да нетрадыцыйных рэлігійных суполак, але гэта не з’яўляецца афіцыйным вызначэннем. Улады адмаўляюць у афіцыйнай рэгістрацыі ўсім нетрадыцыйным рэлігійным суполкам і суполкам, якія разглядаюцца як секты. Урад звычайна разглядае пратэстантскія суполкі як нетрадыцыйныя, а некаторыя з іх нават як секты. У сакавіку КСРН паведаміла пра існаванне 26 веравызнанняў на тэрыторыі

краіны і 2825 рэлігійных суполак, з якіх 1265 належалі да Беларускай праваслаўнай царквы, 492 да Евангельскіх хрысціян, 432 да Рыма-каталіцкай царквы і 268 да баптыстаў. Некаторыя кангрэгацыі зарэгістраваныя толькі ў сваёй мясцовасці, што прадстаўляе абмежаваныя правы. Толькі кангрэгацыі, зарэгістраваныя на нацыянальным узроўні маюць права запрашэння замежных святароў і пабудовы храмаў. Усе зарэгістраваныя рэлігійныя арганізацыі карыстаюцца падатковымі ільготамі, але толькі БПЦ атрымлівае дзяржаўнае фінансаванне. Дзяржаўныя служачыя не павінны прыносіць клятву або спавядаць элементы культу.

Згодна з палажэннямі 2001 г., Урад патрабуе запрашэнне ад прадстаўнікоў замежных рэлігійных аргінзацый для наведвання краіны. Гэтыя прадстаўнікі павінны атрымаць візу і дазвол КСРН, нават калі мэта іх візіту не звязана з рэлігійнай дзейнасцю, а, напрыклад, з благачыннасцю. Запрашаючыя арганізацыі павінны зрабіць запыт на дазвол запрасіць замежню духоўную асобу, у якім будзе адлюстравана мэта і даты візіту. КСРН разглядае справу на працягу 20 дзён, пасля чаго немагчыма абскардзіць рашэнне. Заканадаўства абмяжоўвае “дэструктыўную дзейнасць” замежных арганізацый у краіне і забараняе стварэнне прадстаўніцтваў арганізацый, чыя дзейнасць правакуе “нацыянальную, этнічную або рэлігійную варожасць” ці можа “негатыўна ўплываць на разумовае і псіхічнае здароўе людзей”.

*Парушэнні свабоды веравызнання*

Урад павялічыў уціск на рэлігійныя суполкі, засноўваючыся не толькі на рэгламентуючым рэлігійную сферу заканадаўстве, але і на загады, у якіх прапісаны дадатковыя правілы і патрабаванні да рэлігійных суполак.

У справаздачны перыяд КСРН адмовіў у рэгістрацыі некаторым рэлігійным суполкам. Улады працягвалі адмаўляць у рэгістрацыі індуісцкай суполцы “Святло Кайласы”, якая звяртаецца з заявай з 1992 г. Іншым рэлігійным суполкам, такім, як Царква Задзіночання і Царква саенталогіі таксама было адмоўлена ў рэгістрацыі.

30 студзеня КСРН выдала дакумент, які ўтрымліваў метадалагічныя патрабаванні для рэгістрацыі і перарэгістрацыі рэлігійных суполак. Згодна з КСРН, гэтыя рэкамендацыі, якія не былі пацверджаны Міністэрствам юстыцыі, прызначаны для спрашчэння працэса рэгістрацыі ўсіх рэлігійных суполак. Сцвярджаецца, што гэта ўнутраны дакумент, які не мае юрыдычнай сілы, але мясцовыя адміністрацыі прымяняюць гэтыя рэкамендацыі для амаўлення рэгістрацыі Саенталагічнай царкоўнай суполкі ў Мінску.

У студзені 2002 г. Саенталагічная рэлігійная суполка ў Мінску падала заяву на рэгістрацыю ў КСРН. Пазней КСРН праінфармаваў сяброў суполкі, што разгляд іх заявы спынены, таму што патрабуецца дадатковая інфармацыя і падрыхтаваў спіс з 246 пытанняў, якія патрабавалі ўдакладнення з боку царквы.

18 кастрычніка 2002 г. Мінскі раённы суд пацвердзіў рашэнне КСРН адмовіць у рэгістрацыі суполцы крышнаітаў на падставе таго, што юрыдычны адрас суполкі быў несапраўдны. Рашэнне было прынята, нягледзячы на той факт, што юрыдычны адрас быў прызначаны мясцовымі ўладамі. Рашэнне КСРН было вынесена праз 17 месяцаў пасля таго, як суполка першапачаткова падала прашэнне на разгляд у Камітэт. Суполка апратэставала рашэнне ў Гарадскім і вярхоўным судах у траўні і лістападзе 2002 г. адпаведна. Абодва суды падтрымалі рашэнне не дазваляць рэгістрацыю рэлігійнай суполцы.

Улады працягвалі адмаўляць у рэгістрацыі Беларускай праваслаўнай аўтакефальнай царкве. У кастрычніку 2002 г. суполка парафіян БПАЦ у Бераставіцкім раёне падала заяву на рэгістрацыю, забракаваную мясцовымі ўладамі. Урад заявіў, што ў 2001 г. суполцы БПАЦ было прапанавана скасаваць слова “праваслаўная” і тады ўлады дазволілі б рэгістрацыю, але БПАЦ адмовілася. Хаця ні Урад ні БПЦ не прызнаюць айца Яна Спасюка святаром, ён адпраўляе службы ў якасці святара пад абаронай парафіян БПАЦ, якія маюць цесныя стасункі з Украінскай праваслаўнай аўтакефальнай царквой. БПАЦ не мае магчымасці навучання святароў, каб забяспечыць патрэбнасці 70 парафій, з-за немагчымасці атрымаць дазвол на рэгістрацыю семінарыі.

Маючыя або не маючыя рэгістарцыю, некаторыя рэлігійныя суполкі сутыкаюцца з цяжкасцямі падчас набыцця або арэнды маёмасці пад месцы набажэнстваў, праблемы з пабудовай цэркваў (Грэка-каталіцкія і пратэстантскія суполкі) або адкрытым навучаннем кліра.

Тэарэтычна грамадзянам не забаронена займацца місіянерскай дзейнасцю, напрыклад, публічна выказваць свае рэлігійныя перакананні, аднак, улады часта перашкаджаюць, або караюць грамадзян, якія прапаведуюць ад імя незарэгістраваных рэлігій. Урад працягвае праводзіць у дзеянне Дэкрэт Савета Міністраў 1995 г., які рэгулюе дзейнасць рэілігійных дзячаў. Дырэктыва Савета Міністараў 1997 г. дазваляе выкладанне асноў рэлігіі зарэгістарванымі рэлігійнымі суполкамі моладзі ў летніх лагерах.

Замежным місіянерам не дазваляецца ўдзел у рэлігійных акцыях па-за межамі устаноў, якія іх запрасілі. Закон прадугледжвае для замежных місіянераў шматразовую ўязную візу тэрмінам на адзін год “для ажыццяўлення рэілігійнай дзейнасці”. Па звестках КСРН у 2002 г. усе запыты аналагічных віз былі задаволены. Статыстыка КСРН паказвае, што каля 1250 іншаземцаў уехала ў краіну для працы ў рэлігійных суполках. Сярод іх: 375 католікаў, 203 пяцідзесятнікі, 142 праваслаўныя, 123 баптысты і 196 іудаістаў. Нягледзячы на прыведзеныя факты, рэлігійныя групы працягвалі адчуваць цяжкасці ў атрыманні віз, нават тыя, што маюць доўгую гісторыю функцыянавання ў краіне. Як вынік падобнага працэсу, Рыма-каталіцкая царква, напрыклад, папоўніла недахоп святароў за кошт адпаведна падрыхтаваных мясцовых жыхароў. У той жа час, каталіцкая царква мела цяжкасці з атрыманнем дазволу на ўезд духоўных асоб, большай часткай з Польшы, каб запоўніць недахоп. Сябры крышнаіцкіх і пратэстантскіх суполак паведамлялі пра немагчымасць запрасіць замежных святароў для ўдзелу ў адпраўленнях рэлігійных культаў.

У перыяд з 2001 па 2002 г., замежнікі, запрошаныя Рыма-каталіцкай царквой, якім папярэдне выдаваліся гадавыя шматразовыя візы на ўезд, атрымлівалі спачатку візы на 6 месяцаў, а затым яшчэ на 3 месяцы без якіх бы то ні было тлумачэнняў. У снежні 2002 г. урад спыніў практыку выдачы віз на тры месяцы для каталіцкага кліра і вярнуўся да выдачы гадавых віз, аднак за больш высокую пошліну, чым да таго. У мінулым, змежныя святары і рэлігіныя дзеячы, не зарэгістраваныя уладамі, або рабіўшыя спробу прапаведніцкай дзейнасці без дазволу улад, ці не маючы запрашэння зарэгістраванай рэлігійнай суполкі, былі высланы з краіны. У дадзены перыяд паведамленняў пра падобныя выпадкі няма. Атрыманне дазволу на прыезд замежным клірыкам або рэлігійным дзеячам ёсць зацягнуты бюракратызаваны працэс. Органы ўнутраных спраў маюць магчымасць высылкі замежных клірыкаў шляхам скасавання іх рэгістрацыі або адмовы ў выдачы дазволаў на часовае знаходжанне ў краіне. Улады могуць прымаць падобныя рашэнні самастойна ці на падставе рэкамендацый Упраўлення рэлігійнымі справамі, абласных выканаўчых камітэтаў або Выканаўчага камітэта па справах рэлігіі горада Мінска.

Другая рыма-каталіцкая духоўная семінарыя была адчынена ў Пінску ў верасні 2001 г., пасля адкрыцця першай у Гродна ў 1989 г. Урад адзначыў, што ў свеце гэтай падзеі замежным святарам не будзе больш дазваляцца працаваць у краіне, хаця падобныя меры не заўсёды выконваюцца на мясцовым узроўні і некаторыя замежныя святары працягваюць выконваць свае абавязкі. Рыма-каталіцкая царква паведаміла, што мясцовыя ўлады ў Гродненскай вобласці прадпрымаюць крокі па абмежаванні колькасці замежных рэлігійных дзеячаў рыма-католікаў і ў красавіку 2002 г. анулявалі дазволы на знаходжанне і выслалі з краіны трох каталіцкіх манахінь. Біскуп павінен атрымаць дазвол ад КСРН на перамяшчэнне замежнага сватара ў іншую епархію.

Пачынаючы з красавіка 2002 г. гродненскімі гарадскімі ўладамі неаднаразова вынесена адмова замежнаму равіну на падставе таго, што ён не валодае ні рускай ні беларускай мовамі.

Паведамленняў аб пераследзе вернікаў у вайсковых частках. Тыя, хто адмаўляецца служыць у баявых частках нясуць службу ў будаўнічых або інжынерных батальёнах.

Па словах Урада дазваляецца выкарыстанне жылой маёмасці для адпраўлення рэлігійных абрадаў калі памяшканне не выкарыстоўваецца па прызначэнні. Жыллёвае заканадаўства прадугледжвае магчымасць выкарыстання жылой маёмасці ў нежылых мэтах з дазволу мясцовых выканаўчых і адміністратыўных улад. З 2000 г. мясцовыя улады пашыраюць выкарыстанне гэтага палажэння, падвяргаючы абавязковай рэгістрацыі маёмасць рэлігійных суполак. Паводле дадзеных Урада 2002 г. 110 рэлігійных суполак, уключаючы 34 пратэстантскія дэнамінацыі зарэгістравалі саю маёмасць падобным чынам, аднак, нягледзячы на гэта, улады працягваюць адмаўляць у рэгістрацыі многім пратэстантскім канфесіям і нетрадыцыйным рэлігійным суполкам, якія ўключаны ў адпаведны спіс. Ім адмоўлена ў магчымасці выкарыстоўваць іх маёмасць у рэлігійных мэтах з прычыны таго, што гэтыя групы не з'яўляюцца

зарэгістраванымі рэлігійнымі групамі. Пры гэтым, рэлігійная суполка павінна мець юрыдычны адрас для рэгістрацыі. Рэлігійныя суполкі, якія не могуць атрымаць рэгістрацыю, змушаны да нелегальнай дзейнасці або сходаў у прыватных памяшканнях сяброў суполкі. Шэраг пратэстантскіх суполак не робяць нават спробы зарэгістарвацца, таму што не вераць у магчымасць атрымання дазволу на рэгістрацыю іх суполак ад уладаў.

2 катарычніка 2002 г. гродненскія абласныя ўлады выдалі загад, згодна якому абласныя кінатэатры павінны былі скасаваць дамовы арэнды з рэлігійнымі суполкамі на правядзенне рэлігійных богаслужэнняў у памяшканнях кінатэатраў. Выконваючы гэты загад, кінатэатр "Гродна" скасаваў усе пагадненні з царквой "Жывога слова".

14 лістапада 2002г. Мінскі выканаўчы камітэт абавязаў мясцовыя камітэты назіраць за выкананнем закона "Аб рэлігіях". Інструкцыі, накіраваныя ў мясцовыя камітэты, прадпісвалі здзяйсняць праверку тэрміна дзеяння дагавораў арэнды памяшканняў, прызначаных для правядзення рэлігійных абрадаў рэлігійнымі суполкамі, а таксама колькаснасць удзельнікаў і наяўнасць дазволу на правядзенне падобных збораў. Суполка пяцідзесятнікаў паведаміла, што мясцовыя ўлады дапытвалі іх святароў і абавязалі іх прадставіць інфармацыю пра суполку, уключаючы спіс яе сяброў, у той час як наяўнасць падобнага спісу не прадугледжваецца законам. Пастары адмовіліся прадставіць гэтыя спісы.

У снежні 2002 г. КСРН накіраваў патрабаванні да абласных уладаў спачатку высвятляць грамадскую думку наконт маючай адбыцца пабудовы культавага будынку або перабудовы ўжо існуючага будынка для рэлігійных адпраўленняў. Згодна з пастановай КСРН, улады валодаюць паўнамоцтвамі забараніць узвядзенне храмаў або перабудову існуючых будынкаў у храмы рэлігійнымі суполкамі, спасылаючыся на негатыўнае стаўленне грамадства да гэтага, нягледзячы на тое, што падобнае законам не агаворана.

У адлюстроўваемы ў дакладзе перыяд шэраг традыцыйных і нетрадыцыйных рэлігійных суполак працягвалі сутыкацца за праблемай набыцця маёмасці, у выніку намаганняў урада абмежаваць магчымасць суполак да заснавання малельных дамоў. У справаздачны перыяд улады анулявалі ранейшы дазвол на размяшчэнне маёмасці суполкі пяцідзесятнікаў у вёсцы Дружны, матывуючы гэта тым, што суполка спачатку павінна высвятліць грамадскую думку. Абласныя ўлады адмянілі рашэнне мясцовых і апошнія прапанавалі суполцы тры ўчасткі зямлі на выбар. Улады па-ранейшаму не давалі дазвол евангелістскай суполцы "Новае жыццё" на пабудову храма ў Мінску.

13 верасня 2002 г. Ібрагім Канапацкі, служка муфтыя Рэлігійнага задзіночання мусульман Беларусі абвінаваціў мінскія гарадскія ўлады ў павышэнні падатковых збораў на зямлю, дзе задзіночанне будуе мячэць, з мэтай запавольвання і перашкод будаўніцтву адзінай гарадской мячэці. Аднак, у красавіку Мінскі гарадскі савет прыняў рашэнні аб зніжаным падаткаабкладанні для рэлігійных суполак. Рашэнне задаволіла прэтэнзіі Рэлігійнага задзіночання мусульман Беларусі.

У кастрычніку 2002 г. мясцовыя ўлады пасёлка Бараўляны Мінскай вобласці адмовіліся даць дазвол суполцы поўнага Евангелля на аднаўленне прыватнага дома і прыстасаванне яго пад царкву. Суполка атрымала ўсе неабходныя дазволы ад мясцовых уладаў і Камітэт па справах рэлігіі Мінскай вобласці даў адпаведны дакумент, каб пацвердзіць рэгістрацыю суполкі. Нягледзячы на пацвярджэнне аб рэгістрацыі і той факт, што толькі Мінскія абласныя ўлады маюць права выносіць падобныя рашэнні, Камітэт па справах рэлігіі незаконна адмовіў суполцы. КСРН спаслаўшыся на скаргі, атрыманыя ад гармадзян, якія абвінавачвалі сяброў суполкі ў незаконных пранікненнях у іх дамы з прапаведніцкімі намерамі, крадзяжы праваслаўных нацельных крыжаў і прыналежнасці да незарэгітсраванай секты. Па некаторых звестсках, скарга была падрыхтаваная святаром БПЦ. Нягледзячы на прашэнне суполкі, пададзенае на разглад Генеральнай пракуратуры, ніякага следства па справе не вялося.

Урадам прадугледжаны спецыфічныя меры па забеспячэнні правапарадку і грамадскага спакою пры правядзенні публічных сходаў. Адміністрацыі вялікіх залаў выкарыстоўваюць гэты дэкрэт у якасці падставы для адмаўлення або непрадаўжэння дагавораў арэнды з рэлігійнымі суполкамі. Нетрадыцыйныя рэлігійныя суполкі фактычна не мелі магчымасці арэндаваць залы для арганізацыі богаслужэнняў. Суполка хрысціян поўнага Евангелля паведаміла пра тое, што за перыяд, які ахоплівае дадзены даклад, мінскія ўлады па меншай меры 5 разоў адмаўлялі ў арэндзе памяшкання суполцы. У адным выпадку, 30 верасня 2002 г. Мінскі гарадскі суд абверг ранейшую пастанову раённага суда ад чэрвеня 2002 г. дазваляўшую царкве арэндаваць памяшканне. У апісваемы перыяд пратэстанты накіроўвалі шматлікія заяўкі ў КСРН з просьбай дазволіць ім арэнду маёмасці для правядзення богаслужэнняў, апошні раз у чэрвені. Аднак, у адказ на запросы КСРН паведаміў, што падобныя рашэнні выносяцца толькі мясцовымі ўладамі.

Нягледзячы на тое, што каталіцкая царква адчыніла новы храм у Мінску ў першай палове 2002 г., яна спасылаецца на цяжкасьці пры атрыманні дазволу ад мясцовых уладаў на пабудову дадатковых храмаў у Мінску. Маецца шэраг падрабязных паведамленняў аб адмовах пабудаваць новыя каталіцкія храмы ў Брэсцкай вобласці.

Нягледзячы на тое, што Грэка-каталіцкая царква мае афіцыйную рэгістрацыю, яна сутыкалася з шэрагам праблем з Урадам з-за гістарычнай напружанасці, якая існуе паміж Грэка-каталіцкай і праваслаўнай царквой і падкрэсленым выкарыстаннем беларускай мовы царквой. Разам з некаторымі пратэстантскімі дэнамінацыямі, грэка-каталіцкія кангрэгацыі таксама зазналі цяжкасці з арэндаваннем памяшканняў для адпраўлення набажэнстваў.

Няма звестак аб тым, што рэлігійныя суполкі былі пазбаўлены маёмасці за адлюстраваны ў дакладзе перыяд, аднак, улады перыядычна спынялі несанкцыянаваныя рэлігійныя сходы ў прыватных кватэрах.

Падкантрольныя дзяржаве перыядычныя выданні таксама як і выданні, якія супрацоўнічаюць з БПЦ, працягвалі друкаваць артыкулы, скіраваныя супраць пратэстантаў і нетрадыцыйных вераванняў. Артыкул, які ў верасні

2002 г. з’явіўся ў газеце “Святая Русь” абвінавачвае пратэстантаў, пяцідзесятнікаў і крышнаітаў у негатыўным стаўленні да традыцыйных канфесій, адсутнасці патрыятызму і незаконным ужыванні наркотыкаў.

У красавіку і траўні мінская суполка свядомасці Крышны і Задзіночанне хрысціян веры евангельскай падалі незалежныя прашэнні Генеральнаму пракурору выключыць падручнік “Чалавек, грамадства і дзяржава” са школьных праграм. Кніга, выдадзеная ў 2002 г. і выкарытоўваемая па ўсёй краіне, апісвае прыкметы рэлігійных сект. Абедзве суполкі, якія раней прылічаліся да сект, сцвярджаюць, што кніга нясе непрыязнае стаўленне да нетрадыцыйных рэлігій. Паводле падручніка, такія групы павінны ва ўсім следаваць рэлігійным лідэрам, строга прытрымлівацца рэлігійнай дактрыны, а таксама дабравольна парываць з усімі грамадскімі сувязямі. Адказ Міністэрства адукацыі ад 30 траўня абараняе выкарыстанне слова “секта” у якасці навуковага тэрміна і адмаўляецца выключыць кнігу з навучальнага працэсу, таксама як адмаўляецца пакараць аўтараў. У адказе нічога не гаворыцца пра пратэст крышнаітаў на упамін іх суполкі ў кнізе. Аднак, міністэрства паабяцала не толькі праінструктаваць настаўнікаў, каб яны надавалі больш увагі гэтаму прадмету, але і ўлічвалі заўвагі, выказаныя суполкамі крышнаітаў і евангелістаў, а таксама выправіць спрэчныя месцы пры перавыданнях падручніка. Непакоячыся за бяспеку, сябры незарэгістраванай баптыстскай суполкі ў Брэсцкай вобласці вымушаны былі забраць сваіх дзяцей з заняткаў. У сакавіку Міністэрства адукацыі выдала іншы падручнік з інструкцыямі адносна рэілігій, “Дапаможнік па рэлігіязнаўству”, у якім крышнаіты, евангелісты і саентысты апісваюцца як “неакульты” і “секты”.

У перыяд, які ахоплівае справаздача, падкантрольная дзяржаве газета “Народная газета” працягвала публікацыі, скіраваныя супраць пяцідзесятнікаў, артыкулы прысвечаны смерці ў 2000 г. у Старых Дарогах дыякана Задзіночання хрысціян веры евангельскай Ігара Арлоўскага. Артыкуклы, якія з’явіліся ў 4 нумарах газеты, працягваюць сцвярджаць, што пастар быў прынесены ў ахвяру евангелістамі. Згодна з артыкулам ад снежня 2002 г. царква адмовіла маці дыякана, калі апошняя звярнулася з просьбай аб аказанні медыцынскай дапамогі яе сыну, які паміраў ад цыроза пячонкі. Пасля яго смерці маці абвінаваціла царкву ў наўмысным атручэнні яе сына з мэтай ахвяравання. Гэта гісторыя таксама прагучала ў тэлевізійнай праграме “Права человека: взгляд в мір”. Вядучы праграмы Яўген Новікаў узяў інтэрвью ў маці дыякана, якая абвінаваціла царкву ў “прынясенні ў ахвяру” яе сына. Маці дыякана падала на Задзіночанне хрысціян веры евангельскай і пастара царквы Старыя Дарогі іск аб кампенсаванні маральнага ўрону. Яе справа была закрыта Мінскім судом.

У маі 2001 г. Задзіночанне хрысціян веры евангельскай  падало на Новікава, Беларускую тэлерадыёкампанію, “Народную газету” і маці дыякана іск аб паклёпе. 1 красавіка 2002 г. Мінскі гарадскі суд падтрымаў папярэдняе рашэнне раённага суда, згодна з якім Новікаў павінен быў прынесці публічнае выбачэнне за паклёп на Задзіночанне. Выбачэнні  Новікава трансляваліся ў праграме “Па сутнасці” 21 чэрвеня. Замест выбачэнняў, аднак, выступленне Новікава было напоўнена антыпратэстантскімі заўвагамі і ўключала яго выбачэнні “сектантам”. Праграма транслявалася па

дзяржаўным Беларускім Тэлебачанні. Згодна з паведамленнем КСРН, у адказ на пратэст суполкі пяцідзесятнікаў камітэт паслаў запыт аб прадстаўленні копіі запісу праграмы тэлекампаніяй. Аднак, БТ адмовілася прадставіць копію праграмы. КСРН адказаў суполцы, што вынесці рашэнне, засноўваючыся на запісы праграмы не магчыма і параіў звярнуцца ў суд з гэтай справай. КСРН пазней сцвярджаў, што 23 чэрвеня Новікаў прынёс паўторныя выбачэнні, за каментарыі падчас праграмы 21 чэрвеня. Аднак, пратэстантская суполка адзначыла, што ніякія выбачэнні не гучалі ў эфіры.

У нумары падкантрольнай дзяржаве газеты “Рэспубліка” 18 красавіка з’явіўся артыкул, у якім сцвярджалася, што вучань адной са школ Магілёва трапіў пад шкодны ўплыў аднаго з настаўнікаў-саентолагаў, і толькі праз год псіхіятрычнага лячэння ён быў пазбаўлены “замбіравання”. Артыкул таксама называе саенталогію дэструктыўнай сектай, якая нелегальна дзейнічае ў краіне.

Серыя дакументальных фільмаў, скіраваных супраць пратэстантаў, асабліва пяцідзесятнікаў і каталікаў як дэструктыўныя групы, якія выконваюць фанатычныя абрады і прадстаўляюць пагрозу для грамадства былі паказаны ў 2000 і 2001 гг. У сакавіку і красавіку 2001 г. у іншым цыкле фільмаў паказаным па дзяржаўнаму тэлабачанню, пратэстантаў абвінавачвалі ў прынясенні чалавечых ахвяр, атручэнні дзяцей і выкананні іншых “дэструктыўных рытуалаў”. У гэтых фільмах прадстаўнікі КСРН сцвярджалі, што пратэстантскія групы падрываюць дзяржаўны лад, з’яўляюцца агентамі Захаду і прапаноўвалі забараніць іх дзейнасць у краіне. КСРН і суды адхілілі патрабаванні каталіцкіх і пратэстантскіх груп спыніць гэтыя перадачы. Згодна з паведамленнямі дэпутацкай групы Ніжняй Палаты парламента і пратэстантскім суполкам, члены БПЦ паказвалі гэтыя фільмы дэпутатам Ніжняй палаты з мэтай перканаць дэпутатаў прыняць новы закон аб рэлігіі.

Памеры рэстытуцыі маёмасці заставаліся абмежаванымі на працягу ўсяго перыяду, які ахоплівае дадзены даклад. У гэты час не існуе юрыдычных аснаванняў для рэстытуцыі маёмасці канфіскаванай падчас савецкай і нацысцкай акупацыі, і закон абмяжоўвае рэстытуцыю маёмасці, якая выкарыстоўваецца для культурных і адукацыйных мэтаў. Многія былыя сінагогі ў Мінску выкарыстоўваюцца як тэатры, музеі, спарткомплексы, а ў адной з іх нават размяшчаецца піўны бар, які належыць нямецкай кампаніі. Большасць зваротаў габрэйскай суполкі з просьбай аб вяртанні сінагог былі адхілены. Вяртанне аб’ектаў маёмасці, якія раней належалі рэлігійным суполкам, насіла разрознены і непаслядоўны характар, і мясцовыя ўлады, як правіла, не жадаюць ісці насустрач. На працягу апошніх некалькіх гадоў габрэйскай суполцы ўдалося ўпэўніць улады вярнуць ёй некалькі аб’ектаў маёмасці ў Мінску і іншых гарадах. Аднак большая частка маёмасці ўсё яшчэ дагэтуль не вернута. Некалькі зваротаў маёмасці рэлігійным суполкам адбылося прыватным чынам і непаслядоўна, мясцовыя ўлады ў асноўным неахвотна супрацоўнічаюць у гэтым накірунку. Згодна са звесткамі габрэйскіх суполак, найбольш прыкметны выпадак вяртання маёмасці адбыўся ў чэрвені 2002 г., калі мясцовыя ўлады вярнулі габрэйскай суполцы будынак сінагогі ў Бабруйску. У 200 і 2001 гг. улады ў Маладзечна і Калінкавічах вярнулі маёмасць габрэйскім суполкам. Хаця намаганні

каталіцкай царквы па вяртанню былой царкоўнай маёмасці былі даволі паспяховымі, каталіцкая царква паведамляла, што ёй не ўдалося дабіцца звароту 21 былога каталіцкага касцёлу. Грэка-каталіцкая царква зазначала, што ёй была вернута толькі адна з многіх цэркваў, канфіскаваных у яе, калі гэты рэгіён быў анексіраваны Расійскай Імперыяй. Па ўсёй бачнасці, Руская праваслаўная царква найбольш паспяхова вырашае пытанне звароту маёмасці. Аднак шэраг іскаў аб рэстытуцыі, паданых Рускай праваслаўнай царквой, заставаўся незадаволеным у канцы перыяду, які ахоплівае дадзены даклад.

Дзяржаўныя чыноўнікі выканалі шэраг дзеянняў, якія сведчаць аб знявазе да інтарэсаў членаў яўрэйскай суполкі. У студзені аднавіліся будаўнічыя работы пачатыя на спартыўным стыдыёне ў Гродна , пабудаваным у 1950-я гг. на месцы былога габрэйскага цвінатра, які існаваў з 1600-х гг. Падчас экскаватарных работ рабочыя знайшлі рэшткі чалавечых касцей, якія былі выкапаны для далейшага перазахавання. Фатаздымкі, зробленыя габрэйскай суполкай, дэманструюць не толькі чалавечыя рэшткі, змешаныя з зямлёй і смеццем, але і рэшткі касцей, змешаныя з зямлёй з паверхні і выкарыстоўваемыя для закладкі асфальта. Нягледзячы на пратэсты мясцовай суполкі габрэяў і міжнародных габрэйскіх задзіночанняў спыніць будаўнічыя работы, і супраць неналежнага абыходжання з рэшткамі, будаўніцтва на месцы працягваецца. Хаця улады Гродна і ўключыліся ў дыялог з мясцовымі габрэйскімі суполкамі з мэтай прыняць адпаведную пастанову аб перазахаванні рэшткаў і пабудове мемарыялу, згодна традыцыі, аднак, ніякага фармальнага пагаднення не было заключана паміж мясцовай габрэйскай суполкай і ўладамі на канец справаздачнага перыяду.

У верасні 2002 г.  улады вырашылі змяніць статус габрэйскага цвінтара горада Магілёва, які быў надазены яму ў 2001 г., на статус агульнагарадского цвінатара. Выконваючы рашэнне, улады дазволілі перанос чалавечых рэшткаў і надмагільных помнікаў з краёў цвінтара для вызвалення месца пад негабрэйскія захаванні. Рэшткі касцей, выкапаныя з зямлі, былі пакінуты на паверхні. У чэрвені габрэйская суполка даслала пратэст Прэзідэнту Лукашэнка з патрабаваннем спыніць падобныя дзеянні. У выніку пратэсту і аказання ціску на мясцовыя ўлады, апошнія забаранілі ўсе негабрэйскія пахаванні на Габрэйскім цвінтары Магілёва. 30 чэрвеня суполка падала прашэнне аб адмене рашэння верасня 2002 г. і вяртанні статуса Габрэйскага цвінтара гарадскому цвінатару.

9 ліпеня 2002 г.прыблізна 30 чалавек з мясцовай габрэйскай суполкі пратэставалі супраць будаўніцтва жылога комплекса ў цэнтры Мінска на месцы, дзе раней размяшчаліся 2 сінагогі. У лістападзе 2002 г. 79 са 108 дэпутатаў Ніжняй палаты Нацыянальнага Сходу накіравалі петыцыю Прэзідэнту Аляксандру Лукашэнка з прашэннем спыніць разбурэнне габрэйскіх помнікаў у Мінску. У студзені 2002 г. Дзяржаўны камітэт па кантролю адхіліў хадайніцтва, спасылаючыся на Прэзідэнта Лукашэнка.

19 верасня 2002 г. Мінскі гарадскі суд падтрымаў рашэнне раёнага суда спыніць судовы іск лідэра мясцовай габрэйскай суполкі на аднаўленне разбуранай у 2001 г. сінагогі.

У студзені 2002 г. уладамі Брэста быў спачатку затрыманы, а потым адпушчаны 17-ці гадовы юнак, які ўчыніў акт вандалізму адносна мемарыяла ахвярам генацыда.

У дадзены перыяд  Урад зрабіў некаторыя крокі у дачыненні да габрэйскіх суполак. 24 ліпеня Прэзідэнт Лукашэнка выдаў загад, дзе гаворыцца аб тым, што няма ніякіх падстаў для антысемітызму ў краіне. У траўні, пасля кансультацый з Генеральным пракурорам і КСРН Міністэрства інфармацыі загадаў выдаліць расійскую газету “Рускі веснік” з кіёскаў і магазінаў Мінска. Рашэнне паследавала пасля скаргі ад 3 красавіка некалькіх габрэйскіх лідараў забараніць газету, якая друкавала антысеміцкія матэрыялы.

25 лістапада ў інтэрв’ю “Беларускай газеце” Касцян заявіў, што змагаецца са спробамі “пераўтварыць Беларусь у плацдарм сіянізму”. Пры гэтым ён дадаў: “Калі мячэць ці сінагога перашкаджаюць будаванню горада, я лічу, што можна пусціць яе пад нож бульдозера”. Гэтая яго заўвага была зроблена ў адказ на падпісаную Ніжняй палатай 12 лістапада петыцыю, якая заклікала захаваць яўрэйскія культурныя памятныя мясціны.

У артыкуле ад 23 літапада 2002 г., надрукаваным у «Народнай газеце», галоўны рэдактар газеты Адміністрацыі Прэзідэнта Эдуард Скобелеў празваў уплыў «дзесяці зарэгістраваных габрэйскіх суполак на Беларусі» і міжнародных габрэйскіх арганізацый шкодным для «барацьбы за гістарычную справядлівасць». Некалькі габрэйскіх суполак нагадалі, што Скобелеў надрукаваў шэраг антысеміцкіх артыкулаў яшчэ падчас свайго членства ў Камуністычнай партыі ў 1990-х гг.

Нягледзячы на рашэнне аб забароне распаўсюджвання «Рускага весніка», у адлюстарваны ў дакладзе перыяд антысемітская літаратура працягвала прадавацца ў дзяржаўных будынках і магазінах, а таксама ўстановах не прама звязаных з БПЦ. Антысеміцкая літаратура свабодна прадавалася падчас Красавіцкага вербнага кірмаша, праваслаўнай гандлёвай выставы. Антысеміцкая і руская ультранацыяналістычная літаратура прадаецца ў магазіне “Праваслаўная кніга”, які гандлюе праваслаўнай літаратурай і прадметамі культу.

У ліпеньска-жнівеньскім выпуску дзяржаўнага літаратурнага часопіса «Нёман» была надрукавана аповесць Аляксандра Проханава, галоўнага рэдактара расійскай нацыяналістычнай газеты «Завтра». Аповесць «Господин Гексокен» уключае шматлікія антысеміцкія выказванні.

Згодна з дадзенымі КСРН, камітэт рэгулярна адказвае на ўсе публічныя праявы ксенафобіі папярэджаннем адпаведных дзяржаўных органаў, адказных за прымяненне законных мер супраць такіх праяў. Аднак, за адлюстраваны ў дакладзе перыяд, падобных дзеянняў не назіралася.

*Парушэнні свабоды веравызнання*

На працягу справаздачнага перыяду Урад неаднаразова прадпрымаў дзеянні, парушаючыя сабоду веравызнання некаторых рэлігійных суполак. Нягледзячы на тое, што мясцовыя ўлады выдалі пашпарты сям’і святара

БПАЦ Яна Спасюка, якія не маглі іх атрымаць пачынаючы з 2001 г., Урад не раз здзяйсняў акцыі супраць святара БПАЦ і суполкі БПАЦ у вёсцы Пагранічны.

Урад працяглы час пераследваў, аказваў уціск, пагражаў і арыштоўваў сяброў незарэгістраванай індуісцкай суполкі “Святло Кайласы”. 13 ліпеня 2002 г. міліцыя арыштавала 18 сяброў гэтай суполкі падчас падрыхтоўкі да чыну медытацыі ў Мінскім парку. Некалькі з арыштаваных правялі ў турме 2 дні і павінны былі заплаціць высокія штрафы. 9 жніўня міліцыя спыніла шлюбную цэрымонію на прыродзе, якую праводзіла суполка. 17 жніўня 2002 г. міліцыя разагнала дэманстарцыю, налажаную суполкай у знак пратэсту супраць ціску, які Урад аказвае на “Святло Кайласы”. 6 сяброў суполкі былі змешчаны ў турму на 10 дзён, уключаючы Таццяну Акаданаву, лідэра суполкі, і яе мужа Сяргея, святара. Акаданавы апведамілі, што падчас затрымання міліцыя адмовілася ўмяшацца, калі мінак напаў і збіў Таццяну, а потым адмовіла ёй у медыцынскай дапамозе. Незатрыманыя сябры суполкі атрымалі вялікія штрафы.

17 сакавіка сябры суполкі пяцідзесятнікаў падалі скаргу супраць Мікалая Сініцына, старшыні праўлення вёскі Слабодка. Сініцын, разам з іншым мясцовым чыноўнікам, сарвалі малебен пяцідзесятнікаў і чытанне Бібліі ў прыватным доме. Сініцын папярэдзіў прысутных, што яны з’яўляюцца ўдзельнікамі несанкцыянаванага сходу і пагражаў выклікаць міліцыю ў выпадку калі яны прадоўжаць сустрэчы.

Падчас складання даклада, некалькі пяцідзесятнікаў былі афштрафаваныя за незаконнае правядзенне і размяшчэнне рэлігійных сходаў. Паводле КСРН пакаранне за падобныя парушэнні засноўваліся на нелегальным распаўсюджванні рэлігійнай літаратуры ці правядзенні сходаў без дазволу ўладаў. Закон дазваляе людзям збірацца для малебнаў у прыватных дамах, аднак, ён абмяжоўвае адпраўленне рытуалаў, абрадаў і культаў і патрабуе папярэдняга дазволу мясцовых уладаў на правядзенне падобных дзеянняў.

25 траўня міліцыя разагнала малебен індуісцкай суполкі, увараваўшыся ў прыватную кватэру. Міліцыя папярэдзіла ўдзельнікаў, што адобная дзейнасць з’яўляецца незаконнай для незарэгістраванай рэлігійнай суполкі і што сябры будуць арыштаваныя, калі прадоўжаць падобныя дзеянні ў далейшым. 1 чэрвеня міліцыя спыніла іншы малебен, які адбываўся на іншай кватэры, і прымусіла ўдзельнікаў разысціся. Калі удзельнікі пакідалі кватэру, прыбыў атрад міліцыі, узброены аўтаматамі, і, зрабіўшы вобшук у прысутных, паклалі іх тварамі ў падлогу, і прадоўжылі вобшук кватэры, прычыніўшы, па словах пацярпелых, значныя старты маёмасці. 25 чэрвеня ўлады зноў умяшаліся ў іншы малебен на прыватнай кватэры і дапыталі яе ўладальніка.

На працягу справаздачнага перыяду ўлады затрымлівалі, пераследвалі і штрафавалі некаторых крышнаітаў за незаконнае распаўсюджванне рэлігійнай літаратуры. Суполка паведаміла, што спачатку ўлады затрымалі некаторых сяброў за незаконнае распаўсюджванне рэлігійнай літаратуры, а потым аштрафавалі іх за парушэнні візавага рэжыму або праблемы з іншай дакументацыяй. У кастрычніку 2002 г. распаўсюджвальнік крышнаіцкай літаратуры ў Гомелі быў затрыманы на 3 дні. Паводле словаў сяброў

суполкі крышнаітаў, у студзені 2002 г. следчы прымяніў сілу для затрымання некалькіх распаўсюднікаў рэлігійнай літаратуры. Пазней усе яны былі аштрафаваныя.

21 траўня 2001 г. улады зноў арыштавалі Яна Спасюка, калі ён спрабаваў правесці службу ў вёсцы Радаўляны (Бераставіцкі раён). Затым Спасюк і яго жонка былі выкліканы ў суд, дзе на закрытым пасяджэнні Спасюк, які не меў магчымасці выклікаць сведкаў ці атрымаць юрыдычную дапамогу, быў затрыманы і аштрафаваны за дробнае хуліганства. У выніку прамога ўціску і пераследу з боку Урада ў дачыненні паважаных рэлігійных суполак, святар Беларускай праваслаўнай аўтакефальнай царквы Ян Спасюк і лідэры суполкі "Святло Кайласы" Таццяна і Сяргей Акаданавы пакінулі краіну ў 2003 г.

16 верасня 2003 г. агенцтва "Кестан Ньюз Сэрвіс" працытавала словы Аляксандар Антанюка, сябра незарэгістраванай суполкі БАПЦ вёскі Пагранічны, які паведаміў, што некалькі сяброў суполкі былі выкліканы ў мясцовае ўпраўленне спраў у вёску Бераставіца. Як паведамляецца, мясцовыя ўлады пагражалі сябрам суполкі БАПЦ стратай працы, калі тыя не перастануць падтрымліваць айца Яна Спасюка. Прадстаўнікі мясцовых улад абвяргалі падобныя сцверджанні. У траўні сястра айца Спасюка была звольнена з працы, пасля таго, як Ян Спасюк выказаў намер прасіць палітычнага прытулку. Таксама ёсць звесткі аб здарэнні ўціску на працы з-за спавядання людзьмі пратэстантызму.

Сябры суполкі "Святло Кайласы", якія былі аштрафаваныя за ўдзел у незаконных дэманстрацыях і акцыях пратэсту, паведамілі, што ўлады пагражалі ім канфіскацыяй маёмасці і дадатковымі мерамі пакарання, калі яны не выплацяць штрафы. Улады таксама пагражалі, прыціскалі і папярэджвалі членаў іх сем'яў. 25 сакавіка ўлады прымусілі бацькоў аднаго з сяброў суполкі заплаціць непамерны штраф за сына. На працягу складання даклада, сябры суполкі паведамлялі аб фактах звальнення іх з працы з прычыны сяброўства ў суполцы. Адна з сяброў паведаміла, што была зваольнена з працы таму што яна "сектантка". Мясцовыя ўлады папярэдзілі супрацоўнікаў адной з кампаній, што яна будзе зачынена, таму што дырэктар кампаніі з'яўляецца сябрам суполкі.

2 кастрычніка 2002 г. улады папярэдзілі Васія Юрэвіча, пастара Царквы Новага жыцця за незаконны пратэст супраць прыняцця закона аб рэлігіі. 8 лістапада 2002 г. агенцтва "Кестан Ньюз Сэрвіс" паведаміла, што міліцыя затрымала двух дэманстрантаў-католікаў, якія выражалі пратэст супраць прыняцця закона аб рэлігіі стоячы насупраць будынка Парламента ў Мінску. Аднак, гэтае паведамленне не пацвердзілі ні Рыма-каталіцкая царква ні КСРН.

9 лістапада 2002 г. міліцыя спыніла сход саенталагічнай суполкі ў мінскай кватэры. 2 чалавекі былі пакараныя штрафам у памеры прыблізна 25$ (50000 беларускіх рублёў) за ўдзел у нелегальным сходзе. 26 лютага, пасля разгляду абскарджання, пададзенага суполкай, Мінскі суд адмяніў выкананне пакарання.

1 жніўня 2002 г. мясцовыя ўлады памежнай вёскі Пагранічны Гродненскай вобласці знішчылі царкву БАПЦ, якая, па іх сцверджанні, была пабудавана незаконна, таму што дазвол на будаўніцтва быў выдадзены для пабудовы прыватнага дома. Царква была знішчана нягледзячы на тое, што суполка атрымала дазвол на ўзвядзенне будынка ў ліпені 2001 г. папярэднічалі разбурэнню царквы арышты трох журналістаў, якія знаходзіліся на месцы дзеяння.
Звестак пра затрыманых або зняволеных па рэлігійных матывах няма.

*Прымусовае схіленне да веры*

Паведамленняў аб прымусовым схіленні да веры, уключаючы невялікую колькасць грамадзян ЗША, якія былі выкрадзены ці нелегальна вывезены за межы ЗША, ці паведамленняў аб адмове ім вярнуцца на тэрыторыю ЗША, прадстаўлена не было.

**Раздзел III. Стаўленне грамадскасці**

У асноўным стасункі паміж традыцыйнымі рэлігійнымі суполкамі носяць міралюбівы характар. Згодна з апытаннем, праведзеным у кастрычніку 2002 г. Незалежным інстытутам сацыяльных, эканамічных і палітычных даследаванняў, 57,7 адсоткаў рэспандэнтаў пароўну ставяцца да розных рэлігійных суполак, у той час як 33 адсоткі адчуваюць, што Праваслаўная царква павінна атрымаць урадавыя прывілеі. Антысемітызм і крытычнае стаўленне да рэлігійных меншасцяў працягвалі ўзмацняцца на працягу перыяду, які ахоплівае дадзены даклад.

У двух асобных здарэннях, у траўні і жніўні 2002 г., скінхэдамі здзейснены напады на замежных габрэяў у цэнтры Мінска. У адным з выпадкаў міліцыя з’явілася на месцы здарэння, але не прыняла ніякіх мераў супраць злачынцаў. У верасні 2002 г. невядомыя напалі на равіна і яго сына каля Амбасады Расійскай Федэрацыі ў Мінску. Ахоўнікі амбасады дапамаглі равіну і паведамілі пра здарэнне ў міліцыю, якая распачала дослед справы, але якіх-небудзь значных вынікаў ён не даў. 2 ліпеня 2002 г. сінагога ў Гомелі атрымала папярэджанне аб замініраванні ад невядомага. Міліцыя правяла агляд месца, але бомбы не было выяўлена.

Падчас разглядаемага перыяду невядомыя здзейснілі напад на сяброў суполкі “Святло Кайласы”. Адна з сяброў, Таццяна Жылевіч, была дастаўлена ў шпіталь з пашкоджаннямі галавы. 25 жніўня 2002 г. невядомыя ажыццявілі ўварванне ў прыватнае памяшканне, дзе праводзіліся рэлігійныя службы, учынілі акты вандалізму і разбурылі алтар суполкі і нанеслі іншыя пашкоджанні прадметам культу.

Габрэйскія арганізацыі працягваюць крытыкаваць няздольнасць уладаў абараніць габрэйскі цвінтар і мемарыялы ахвяраў генацыду. У траўні і чэрвені невядомымі былі здзейснены акты вандалізму адносна габрэйскіх а таксама негабрэйскіх надмагілляў на трох цвінтарах Гомеля. Улады хаця і пачалі даследаванне справы, але не зрабілі ніякіх арыштаў. У красавіку і чэрвені 2002 г. каля 70 магільных плітаў на габрэйскім цвінтары Барысава і

каля 19 на мінскім цвінтары былі разбураны вандаламі. 16 ліпеня 2002 г. мясцовыя ўлады барысава затрымалі непаўналетняга па падазрэнні ў прычыснасці да апаганьвання цвінтара. Улічваючы факт, што пад час гэтых дзеянняў былі пашкоджаны таксама негабрэйскія магілы, акты вандалізму не былі прылічаны да антысеміцкіх дзеянняў.

За справаздачны перыяд невядомымі учынены акты вандалізму адносна некалькіх мемарыялаў ахвярам генацыду ў гарадах Беларусі: 26 траўня Мемарыяльны комплекс Яма ў Мінску, Мемарыял ахвярам генацыду ў Цімкавічах і цвінтар у Бабруйску, 28 жніўня 2002 г. мемарыял ахвярам генацыду ў Лідзе.

У дадзены перыяд невядомымі таксама знішчаны ўстаноўленыя ў Курапатах, на месцы масавых растрэлаў НКВД 30000 чалавек у 1930-я гг., крыжы, як праваслаўныя так і неправаслаўныя. Улады не прыклалі ніякіх намаганняў, каб знайсці вінаватых.  У ліпені 2002 г. праваслаўныя жыхары Рубы пратэставалі супраць узвядзення царквы суполкай пяцідзесятнікаў.

Па даных Лігі супраць дыфамацыі і Сусветнага габрэйскага кангрэсу на перыферыі грамадства існуе шэраг ультранацыяналістычных арганізацый, і шэраг газет рэгулярна публікуе антысеміцкія матэрыялы. Антысеміцкія матэрыялы з Расіі таксама шырока распаўсюджаны.

Многія члены габрэйскай суполкі занепакоены канцэпцыяй “агульнаславянскай супольнасці”, папулярнай сярод дзейсных нацыяналістычных арганізацый, уключаючы Русскае народнае адзінтва (РНЕ), якое дагэтуль дзейнічае, нягледзячы на афіцыйны роспуск у 2000 г. і Нацыянальную бальшавіцкую партыю, расійскую экстрэмісцкую арганізацыю.

Афіцыйны праваслаўны каляндар на 2003 г., выдадзены ў Мінску, змяшчае памяць Гаўрыіла Беластокскага, хлопчыка, забітага габрэямі каля Гродна ў 1690 г. У словах малітвы Беластокскаму габрэі называюцца “сапраўднымі звярамі”, якія нібыта выкралі і забілі хлопчыка для выканання рэлігійнага абрада.

У снежні мясцовыя праваслаўныя жыхары Століна звярнуліся ў Столінскі раённы суд з хадайніцтвам адазваць Івана Пашкевіча з займаемай ім пасады дэпутата Ніжняй палаты Нацыянальнага Сходу. У хадайніцтве заяўляецца, што Пашкевіч не выканаў свайго перадвыбарнага абяцання патрымліваць праваслаўную царкву і абвінавачвае яго ў “абароне неакультаў і сектаў”. Пашкевіч, сябра Рэспубліканскай апазіцыйнай фракцыі Нацыянальнага Сходу і заўважная фігура баптысцкай суполкі, адкрыта выступаў супраць закона аб рэлігіі і абмежавання рэлігійных свабод Урадам.

У лютым невядомыя ванадалы намалявалі антымусульманскае графіці ў цэнтры Мінска. 5 ліпеня 2002 г. невядомыя апаганілі мусульманскі цвінтар у Слоніме. 9 лістапада вандалы апаганілі мячэць у Слоніме.

8 чэрвеня невядомыя выцарапалі слова “антыхрыст” на шыльдзе Евангельскай царквы жывой веры ў Гомелі. Царква падверглася падобным

нападам у жніўні і лістападзе 2002 г. прадстаўнікі царквы паведамілі аб нежаданні улад аказваць дапамогу ў расследаванні атак.

27 чэрвеня на ўездзе ў Мінск неўстаноўленая машына збіла аўтамабіль Аляксандра Саковіча, лідэра Задзіночання хрысціян веры евангельскай і вядомага праціўніка рэлігійнага закона, Саковіч не пацярпеў. У хуткім часе Саковічу патэлефанаваў невядомы і папярэдзіў, што наступны раз яму можа так не пашанцаваць.

Няма сведчанняў таго, што БПЦ змяніла свой погляд на магчымасць супрацоўніцтва толькі з канфесіямі, якія маюць "гістарычную аснову" на тэрыторыі краіны. Сябры большасці неналежных да БПЦ рэлігійных суполак выказалі сваё адмоўнае стаўленне да прыняцця закона аб рэлігіі і адкрыта крытыкавалі абмежаванні, якія ўводзіць новы закон і шэраг няпэўнасцей у ім. 18 чэрвеня Задзіночанне хрысціян веры евангельскай заявіла што не будзе праходзіць перарэгістрацыю ў занак пратэсту супраць новага закона.

Напярэдадні прыняцця зменаў да закона "Аб свабодзе веравызання і рэлігійных арганізацыях", прадстаўнікі многіх канфесій, як традыцыйных так і нетрадыцыйных, заснавалі Грамадскую ініцыятыву ў абарону рэлігійных свабод. Група актыхна супрацьстаяла прыняццю закона і іншым абмежаванням Урада, накіраваным супраць рэлігійных суполак. У жніўні 2002 г. група выдала "Белую кнігу", дзе ў падрабязнасцях асвячаюцца парушэнні Урадам свабоды веравызання і даецца інфармацыя аб новым законе.

**Раздзел IV. Палітыка Урада ЗША.**

Амбасада ЗША працягвала сачыць за выкананнем і абаронай рэлігійных правоў, як неадменнай часткі дыскусій па праблеме дрэннай сітуацыі з выкананнем правоў чалавека ў краіне. Амбасада ЗША рэгулярна каардынавала намаганні па абароне рэлігійных правоў сумесна з амбасадамі шэрагу іншых заходнеўрапейскіх краін у Мінску. Супрацоўнікі амбасады рэгулярна наладжвалі сустрэчы з прадстаўнікамі рэлігійных суполкак і чыноўнікамі ўрада, адказнымі за справы рэлігій.

Амбасада ініцыявала і правяла некалькі круглых сталоў з рэлігійнымі лідэрамі, абмяркоўваючы істотныя палажэнні свабоды веравызнання і пераследу яе ўрадам. У кастрычніку і лістападзе 2002 г. Беларусь наведалі прадстаўнікі Дзяржддэпартамента і Агенцыі ЗША па міжнародным развіцці, якія сустракаліся з прадстаўнікамі некалькіх рэлігійных суполак на прадмет высвятлення сітуацыі з выкананнннем свабоды веравызнання. Амбасада ЗША таксама аказвала дапамогу ў правядзенні мерапрыемстваў з удзелам замежных арганізацый, дачынных да праблем рэлігійных свабод. Амбасада таксама надзялала ўвагу судовым працэсам і дэманстрацыям, накіраваным супраць рэпрэсіўнай палітыкі ўлад ў дачыненні шэрагу рэлігійных суполак.

У справаздачны перыяд Урад ЗША зрабіў шэраг прэс-рэлізаў, датычных праблем выканання рэлігійных свабод. 25 чэрвеня 2002 г. Амбасадар ЗША выказаў сваё заклапочанае стаўленне да праекта закона "Аб свабодзе веравызнання і рэлігійных арганізацыях" і звярнуўся да Урада з просьбай забяспечыць права на свабоднае веравызнанне ўсім рэлігійным суполкам. 1

лістапада 2002 г. Дзяржэпартамент прадставіў публічнае заяўленне з крытыкай прыняцця закона і яго асобных жорсткіх абмяжоўваючых палажэнняў. Крытычнае стаўленне дэлегацы ЗША у АБСЕ да нізкага ўзроўню рэлігійных свабод выкладзена ў заяўленні кастрычніка 2002 г. 30 траўня 2002 г. Амбасада асудзіла акты вандалізму супраць мемарыялаў ахвярам генацыду і габрэйскіх могілак у некаторых гарадах краіны.

Насуперак абяцанням абмяркоўваць праблемы свабоды веравызнання з Амбасадай ЗША, Урад зрабіў крокі каб абмінуць дыскусіі ці нават не дапусціць супрацоўнікаў амбасады да збірання інфармацыі па пытаннях свабоды рэлігій. 7 кастрычніка 2002 г. КСРН нечакана адмяніў загадзя запланаваную сустрэчу сваіх прадстаўнікоў з чыноўнікамі Урада ЗША і амбасадарам. 9 кастрычніка 2002 г. тры супрацоўнікі Амбасады ЗША і чыноўнікі Дзяржэпартамента, якія наведалі месца разбуранага храма БПАЦ, былі затрыманыя на 4 гадзіны ў горадзе Пагранічны, нібыта з прычыны нелегальнага перасячэння імі дзяржаўнай мяжы. Мясцовы супрацоўнік Амбасады, які суправаджаў дэлегацыю на маючую адбыцца сустрэчу з главой выканаўчай улады горада Пагранічны для абмеркавання адмоўнага стаўлення Урада ЗША да разбурэння храма БПАЦ, атрымаў афіцыйнае папярэджанне за недахоп дакументаў, прадстаўленых мясцовым уладам для ўстанаўлення асобы.